ЯК ПРАДУХІЛІЦЬ ПАЖАРЫ 5

ЦІКАВОСТКІ МУЗЕЯ Ў ВАЙЦЯШЫНЕ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

8 СНЕЖНЯ 2021 г. СЕРАДА № 237 (29606)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Здароўе работнікаў шмат у чым прадвызначаецца тымі рызыкамі, якія прысутнічаюць непасрэдна на рабочых месцах, таму мы ў большай ступені павінны звярнуць увагу на гэтую праблему, непасрэдна работадаўцамі, паколькі гэта менавіта іх задачы — праз стварэнне здаровых умоў працы, скарачэнне страт рабочага часу ў сувязі з хваробай работнікаў забяспечыць рост прадукцыйнасці працы і паспяховасць функцыянавання прадпрыемстваў у цэлым. Карпаратыўныя праграмы ўмацавання здароўя ўжо паступова ўкараняюцца ў сферу працоўных адносін як элемент карпаратыўнай культуры і інструмент дасягнення канкрэтных вынікаў у сістэме кіравання персаналам. Гэта своеасаблівыя інвестыцыйныя праекты, удзельнікамі якіх выступаюць дзяржава, работадаўца і работнік».

Залатыя скульптуры

Майстар па саломцы і саломапляценні Маладзечанскага раённага Цэнтра рамёстваў Кацярына ЧАРНЫШОВА ў сваёй творчасці аддае перавагу аб'ёмным вырабам. Яе не палохае складаная і шматдзённая работа над скульптурнымі кампазіцыямі. Наадварот, мастачку прывабліваюцца пластычныя і гарманічныя. А свае вобразы Кацярына Мікалаеўна шукае ў такім разнастайным свеце жывёлін і птушак. Яе ўвішнымі рукамі сплецены сімвалы Беларусі — буслы і зубр, якіх часта дэманструюць на выстаўках самабытных майстроў. Апошняя работа Кацярыны — птушка з Чырвонай кнігі — пугач. Філігранная праца, што і казаць! У творчых планах майстрыхі — каралеўскія птушкі: лебедзі. І невыпадкова: мастачка не першы год працуе кіраўніком дзіцячага гуртка ў вёсцы Лебедзева, вучыць малых вяскоўцаў выраблять цікавыя кампазіцыі з прыродных матэрыялаў, у прыватнасці, са сваёй любімай залацістай саломкі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРОТКА

- У ЕАЭС за год найніжэйшы ўзровень беспрацоўя зафіксаваны ў Беларусі.
- **Больш за 3 мільёны беларусаў прайшлі поўны курс вакцынацыі супраць COVID-19.**
- Фестываль для абітурыентаў «Мая дарога ў БДУ» пройдзе анлайн 11 снежня.
- **Фізасобы ў Беларусі 5 месяцаў запар прадаюць валюты больш, чым купляюць.**
- У Беларусі да Новага года зноў дазволілі продаж піратэхнікі.
- **Міжнародны фестываль «Студзеньскія музычныя вечары» вернецца ў Брэст пасля перапынку.**

Без тэрміну даўнасці

У адказе за гістарычную памяць

«Мы толькі цяпер пачынаем усведамляць і падыходзіць да ацэнкі рэальных маштабаў гібелі нашых людзей ад рук фашыстаў і іх памагатых у гады вайны»

Фота БелТА.

Аб гэтым заявіў генеральны пракурор Андрэй ШВЕД падчас круглага стала «Гістарычная памяць: генацыд беларускага народа», які адбыўся ў Палаце прадстаўнікоў. Нагадаем, вясной Генеральная пракуратура распачала крымінальную справу аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд.

СТАР. 4

ВЫПІЎ, ЗАКУРЫЎ, ЗАСНУЎ, НЕ ПРАЧНУЎСЯ...

Разарваць ланцужок трагічных дзеянняў дапамагаюць ратавальнікі Гомельшчыны

У рэгіёне падводзяць вынікі рэспубліканскай акцыі «Не прапальвай сваё жыццё». Яе галоўная мэта — папярэджанне гібелі людзей з-за неасцярожнага абыходжання з агнём пры курэнні ў стане алкагольнага ап'янення. У межах акцыі раённыя падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях арганізавалі нефармальныя мерапрыемствы ў месцах масавага знаходжання людзей. Супрацоўнікі абласнога ўпраўлення МНС у раёнах правялі ўзмоцненыя прафілактычныя рэйды: адны з апошніх — у Добрушы, Гомелі і Гомельскім раёне.

СТАР. 5

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы

ISSN 1990 — 763X

«Пры добра пастаўленай рабоце мы можам дасягнуць мільярда долараў тавараабароту»

Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з кіраўніком Башкартастана Радзіем Хабіравым

Падчас афіцыйнага візіту дэлегацыі кіраўнік Башкартастана сустрэўся таксама з паслом Расіі Яўгенам Лук'янавым, правёў перагаворы з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам. Дэлегацыя з Башкартастана досыць вялікая — больш за 40 прадстаўнікоў прадпрыемстваў рэспублікі, амаль усе галіновыя міністры. Па словах яе кіраўніка Радзія Хабірава, гэта пацвярджэнне таго, што прыехалі працаваць. І не палохаюць, дадае ён, ні ковід, ні санкцыі.

Аляксандр Лукашэнка назваў візіт прадстаўнічай дэлегацыі з Башкартастана знамянальным. І зразумела, чаму. З-за пандэміі вочныя кантакты на ўсіх узроўнях вельмі абмежаваныя. Беларускі лідар падзякаваў суразмоўніку, што ён рызыкнуў прыехаць у «цэнтр Еўропы — і бачыць, што сітуацыя тут стабільная».

Пачаліся афіцыйныя перагаворы з тэмы жыццёвай — пра надвор'е. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якая тэмпература гэтым часам у Башкартастане? «Мінус 16 сёння», — адказаў Радзій Хабіраў.

«У нас таксама заўтра на поўначы да мінус 20 абяцаюць, — працягнуў Прэзідэнт. — Прыкладна такое самае. Я недарэмна гэта сказаў. Пралятаючы ў свой час над Башкартастанам, Татарстанам, я заўважыў, што гэтыя землі такія ж, як у Беларусі. І знешне Башкартастан выглядае як Беларусь. Таму для нас гэты край блізкі».

Такім чынам перайшлі да тэм супрацоўніцтва. Аляксандр Лукашэнка не хавае: у Беларусі да Башкартастана ёсць прагматычны інтарэс — вялікі тавараабарот, звязанасць эканомік. І таму галоўная задача відавочная і вырашальная, сцвярджае Прэзідэнт: «Як мага хутчэй аднавіць дакрызісны гандлёвы абарот, тыя паказчыкі, што мы мелі».

Кіраўнік краіны прывёў лічбы. Так, за 9 месяцаў 2021 года тавараабарот склаў усяго 280 мільёнаў долараў. У параўнанні з аналагічным перыядам 2020 года ён скараціўся на 16 працэнтаў.

«Нам ёсць над чым працаваць, таму, думаю, ваш візіт будзе садзейнічаць выраўноўванню тавараабароту паміж Башкартастанам і Беларуссю», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён мяркуе, што прычыны зніжэння гандлю звязаныя не толькі з пандэміяй. Таму сувязі, праверэныя дзесяцігоддзямі, не павінны дазволіць «рознага кшталту ковідам, заходнім санкцыям разбурыць нашы адносіны», дадае Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны прапанаваў знайсці рэзервы, якія неабходна задзейнічаць для актывізацыі ўзаемадзеяння ў гандлі, намеціць прыярытэтныя кірункі на найбліжэйшую перспектыву. Таму размова была толькі пра эканоміку і бізнес. Палітыку суразмоўнікі пакінулі па-за рамкамі сустрэчы.

«Я не думаю, што нам трэба абмяркоўваць нейкую палітыку. Палітыка ў нас адзіная. Не думаю, што ў нас ёсць нейкія разыходжанні. Радзій Фарытавіч, ваш лозунг «Мы можам лепш!» можна ўпэўнена дапоўніць словамі «Разам мы можам лепш і больш!» — сказаў Прэзідэнт.

Арыенцір для супрацоўніцтва цалкам відавочны, дадае Аляксандр Лукашэнка, — аднавіць аб'ём тавараабароту ў 700 мільёнаў долараў, які дасягнулі ў 2019 годзе.

«Упэўнены, што пры добра пастаўленай рабоце мы можам дасягнуць мільярда долараў тавараабароту. Мы да гэтага гатовыя», — адзначыў беларускі лідар.

Ён мяркуе, што багатая рэсурсная база Башкартастана і прамысловы патэнцыял Беларусі маглі б аб'яднацца для павелічэння паставак прадукцыі машынабудавання. Беларусь гатовая прапанаваць самую сучасную аўтамабільную, сельскагаспадарчую, дарожна-будаўнічую і камунальную тэхніку вядучых беларускіх прадпрыемстваў — МАЗа, МТЗ, «Гомсельмаша», «Амкадора», БелАЗа, а таксама ліфтавае абсталяванне «Магілёўліфтмаша», што карыстаецца цяпер асаблівым попытам.

«Мы заўсёды гатовыя падзяліцца назапашаным вопытам і тэхналогіямі ва ўсіх галінах. Сакрэтаў ад вас ніколі не было і не будзе», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі асаблівую ўвагу звярнуў на сельскагаспадарчыя праекты і прапанаваў узаемадзеянне ў жывёлагадоўлі, племянной справе, вытворчасці ветэрынарных прэпаратаў. «У вас рэспубліка такая, што ёсць дзе разгарнуцца аграрнаму комплексу. Таму мы гатовыя тут падставіць сваё плячо. Нашы напрацоўкі даўно даказалі эфектыўнасць і з'яўляюцца асновай росту аграрнага сектара беларускай эканомікі. Прадукты з Беларусі добра ведаюць і ў Башкартастане», — канстатаваў Прэзідэнт.

Яшчэ адна сфера, да якой гатовыя далучыцца беларусы, — будаўніцтва сацыяльных устаноў: школ, садкоў, культурна-спартыўных аб'ектаў. Але, заўважае Аляксандр Лукашэнка, беларусы будуць пры неабходнасці займацца будоўляй у любой галіне.

Беларусь таксама прапануе сучасныя тэхналогіі і абсталяванне для водаачысткі, водападрыхтоўкі і водаадвядзення, абсталяванне і тэхналогіі поўнага цыкла па сартаванні і перапрацоўцы цвёрдых камунальных адходаў. «Ведаю, і ў вас гэта па Расіі ў цэлым праблема вялікая. У гэтай сферы мы паспяхова працуем з шэрагам расійскіх рэгіёнаў. Чаму б не працаваць з вашай рэспублікай?» — прапанаваў кіраўнік Беларусі.

Вядома, за эканомікай, кажа ён, нельга забываць гуманітарную і інфармацыйную сферы, узаемадзеянне ў галіне адукацыі, навукі і культуры. «Упэўнены, што нашы адносіны не вычэрпваюцца тымі кірункамі, што я назваў. Думаю, што ў працэсе наведвання вамі Беларусі ўзнікнуць новыя кірункі для супрацоўніцтва», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

• Каментарый у тэму

У інтэрв'ю журналістам кіраўнік Рэспублікі Башкартастан Радзій Хабіраў расказаў, што Беларусь — адзін з вядучых гандлёвых партнёраў рэгіёна і патэнцыял росту эканамічных адносін вялікі. Расіяне выказалі асаблівую цікавасць у супрацоўніцтве па машынабудаванні ў розных падгалінах — сельскагаспадарчай і камунальнай.

«Я абмеркаваў цікавы вопыт зборкі вашай сельгастэхнікі. Ён у нас ужо ёсць. У нас буйное прадпрыемства ажыццяўляе зборачную вытворчасць колавых трактароў. Нам неабходныя гусенічныя трактары, бо ў нас сем мільёнаў гектараў ворыўных зямель. Гэта велізарныя аб'ёмы. Нам неабходныя сотні гусенічных трактароў. Таму мы сёння будзем прапрацоўваць пытанне аб магчымай зборцы такіх трактароў», — падзяліўся суразмоўнік.

Радзій Хабіраў адзначыў, што запрасіў Прэзідэнта Беларусі наведаць Башкартастан.

«Аляксандр Рыгоравіч сказаў, што мы дзесьці падобныя. На самай справе! Па працавітасці, адносінах людзей да зямлі, Радзімы, я думаю, тут мы аднолькавыя», — заўважыў Радзій Хабіраў.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Беларусь поўная рашучасці падтрымліваць Сербію і сербскі народ»

Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з сербскім парламентарыем Драгамірам Карычам

Драгамір Карыч — дэпутат парламента Сербіі, старшыня дэпутацкай групы дружбы з Беларуссю ў сербскім парламенце, ганаровы консул нашай краіны ў Бялградзе. Кампанія «Браты Карычы», саўладальнікам якой з'яўляецца Драгамір Карыч, рэалізоўвае ў нашай краіне буйныя праекты ў будаўніцтве.

«Што датычыцца адносін з роднай Сербіяй, я думаю, праблем фактычна няма. У тым ліку дзякуючы дэпутату парламента, вашаму імкненню, такой напорыстасці ў нас добрыя адносіны», — пачаў размову Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што Драгамір Карыч як сябар Беларусі заўсёды падштурхоўваў да супрацоўніцтва кіраўнікоў краін.

«Я вельмі рад, што вы «прызямліліся» ў Беларусі. Знайшлі сваё месца, працуеце. У Беларусі вас вельмі добра ведаюць. Мяркую, што самая вядомая будаўнічая кампанія — гэта ваша. Нават нашы кампаніі не такія вядомыя, як яна. Яна распіяраная, раскручаная, ды і добра будуе», — заўважыў кіраўнік краіны.

Ён падзяліўся: заўсёды захапляўся югаслаўскімі будаўнікамі, якім удалося стандарты якасці падняць на высокі ўзровень. Таму і сёння ўзвядзенне асобных аб'ектаў у беларускай сталіцы сербскім бізнесам ідзе хутчэй за тэрміны.

«Мы рады, што ў нас ёсць такая кампанія, якая эфектыўна працуе», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі перадаў прывітанне свайму сербскаму калегу і пацвердзіў: Беларусь застаецца добрым сябрам для сербскага народа.

«Павінен вам сказаць, што практычна на кожнай сустрэчы з Прэзідэнтам Пуціным мы гаворым пра Балканы. А на Балканах у нас хто? Сербія. Сербія — заўсёды была пунктам апоры для славянства. Яна і сёння такой застаецца», — адзначыў кіраўнік краіны. На яго думку, асаблівую блізкасць балканскай дзяржавы пацвярджае нядаўняя сустрэча Прэзідэнта Сербіі Аляксандра Вучыча з Уладзімірам Пуціным.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што і «Беларусь заўсёды поўная рашучасці, наколькі гэта магчыма, падтрымліваць Сербію і сербскі народ».

Прэзідэнт акцэнтаваў, што падтрымку бачыць сёння таксама з боку Сербіі. Суразмоўнікі ўспомнілі ваенныя падзеі ў Сербіі ў 1990-х. Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі, ён памятае, як сыпаліся бомбы на галовы сербаў, калі бамбілі Бялград.

«Прайшоўшы гэты складаны шлях, нам трэба абавязкова вытрымаць. Мне здаецца, выстаім», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Драгамір Карыч падзяліўся з журналістамі, што санкцыі, акрамя негатыўнага эфекту, маюць і станоўчы — з'яўляюцца актыватарам для магчымасцяў і ўзмацнення краіны. Ён адзначыў, што ўсе складанасці мінуць. «Не можа тут кіраваць ніхто іншы, акрамя беларускага народа. Не можа выбіраць ніхто іншы, акрамя беларускага народа. У нас таксама ёсць такія праблемы — Сербія пастаянна ў нечым вінаватая. Куды б мы ні павярнуліся, ідуць удары. Таму нашу дружбу неабходна захаваць — гэта самае каштоўнае», — адзначыў Драгамір Карыч.

Марыя ДАДАЛКА.

Ва ўрадзе

Адчуваем за спінай дапамогу саюзніка

Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА сустрэўся з кіраўніком Рэспублікі Башкартастан Радзіем ХАБІРАВЫМ.

Па словах беларускага прэм'ер-міністра, развіццё супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі — адзін з прыярытэтаў знешняй палітыкі Беларусі, аснова эфектыўнага гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння і ўмацавання брацкіх адносін паміж краінамі.

Раман Галоўчанка адзначыў, што Башкартастан мае развіты прамысловы, навукова-тэхнічны, аграрны патэнцыялы, перадае яго словы БелТА. Таму візіт дэлегацыі будзе рэзультатыўны і дапаможа прасунуць наперад адносіны, патэнцыял якіх раскрыты не поўнасцю.

Для інтэнсіфікацыі супрацоўніцтва прэм'ер-міністр прапанаваў разгледзець такія напрамкі, як пашырэнне кааперацыі ў вытворчасці спецыяльнай і грузавой тэхнікі, узаемадзеянне ў сферы АПК і ўдзел у мадэрнізацыі аграпрамысловага комплексу Башкартастана. Кіраўнік урада таксама прапанаваў пашырыць узаемадзеянне ў сферы нафтахіміі, будаўніцтва, абнаўлення транспартнай інфраструктуры.

Раман Галоўчанка падчас сустрэчы закрануў тэму санкцый. Ён выказаў упэўненасць, што апаненты Беларусі, якія вылучаюць абмежаванні, не даб'юцца мэт, якія яны маюць на ўвазе. «У першую чаргу таму, што гэта адбываецца насуперак інтарэсам беларускага народа. Па-другое, мы адчуваем за сваімі плячыма, спінай дапамогу нашага саюзніка — Расійскай Федэрацыі. Няма ніякіх сумненняў, што разам мы ў стане вытрымаць любы ціск», — перадае словы прэм'ера БелТА.

ТЭСТ АД ПАДНЯБЕСНАЙ

Супрацоўніцтва з Кітаем выпрабоўваецца часам

Шматгадовае беларуска-кітайскае супрацоўніцтва развіваецца на працягу трох дзесяцігоддзяў. Узаемадзеянне нашых краін выходзіць на новы ўзровень. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 3 снежня падпісаў Дырэктыву № 9 аб развіцці двухбаковых адносін Беларусі з Кітаем. Стратэгічны дакумент накіраваны на далейшае паглыбленне стратэгічнага партнёрства Беларусі з Кітаем па шырокім спектры напрамкаў у 2021—2025 гадах і з'яўляецца лагічным працягам аднайменнай Дырэктывы на 2015—2021 гады, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.



ПАЎСОТНІ КАНКРЭТНЫХ МЕР

Прыярытэтнымі задачамі на найбліжэйшую перспектыву вызначаны ўмацаванне супрацоўніцтва ў палітычнай сферы, захаванне і прымнажэнне каштоўнасцяў дружбы і ўзаемнай падтрымкі, нарошчванне гандлёва-эканамічнага, фінансавага, інвестыцыйнага ўзаемадзеяння, рэалізацыя ініцыятывы «Пояс і шлях». Сярод найважнейшых задач таксама — пашырэнне міжрэгіянальных сувязяў, развіццё супрацоўніцтва ў ваеннай і ваенна-тэхнічнай галінах, у сферы лічбавай эканомікі і інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, умацаванне навуковатэхнічнага ўзаемадзеяння, развіццё адносін у гуманітарнай сферы.

У мэтах выканання названых задач органам дзяржаўнага кіравання і іншым уключаным у супрацоўніцтва з КНР суб'ектам эканамічнай дзейнасці даручаецца забяспечыць рэалізацыю каля паўсотні канкрэтных практычных мер. Эфектыўнае выкананне пастаўленых мэт будзе садзейнічаць вывядзенню двухбаковых адносін на якасна новы ўзровень.

ПАДМУРАК СУМЕСНАГА РАЗВІЦЦЯ

У Беларусі і Кітая аднолькавыя прынцыпы і ідэалогія развіцця, адзначыў БелТА першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай Снапкоў. Ён звярнуў увагу, што для Беларусі заўсёды важна было супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай.

«Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з 1990-х гадоў глыбока адчуў моц і паступальнасць развіцця Кітая, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер. — Асаблівы шлях развіцця Кітая падтрымлівае наш уласны шлях развіцця. Мабыць, менавіта дзве краіны ў свеце ў аснову эканамічнай палітыкі ставяць рост дабрабыту грамадзян. У нас аднолькавыя прынцыпы і ідэалогія развіцця. І нам ёсць на каго раўняцца і на чыю дапамогу разлічваць».

Мікалай Снапкоў падкрэсліў, што краіны Беларусь і Кітай узаемна падтрымлівалі адна адну ў цяжкі перыяд барацьбы з COVID-19, гэта маштабная і сяброўская дапамога. «Падтрымка ёсць, і яна нарошчваецца ў сітуацыі палітычнага і эканамічнага націску з боку краін, не здольных успрымаць адрозныя ад іх «стандартаў» падыходы да грамадскіх інстытутаў», — адзначыў першы віцэ-прэм'ер.

Ён звярнуў увагу на беларуска-кітайскае супрацоўніцтва, якое актыўна развіваецца, у тым ліку міжрэгіянальнае. «Сяброўства і ўсебаковае ўзаемадзеянне паміж абласцямі Беларусі і правінцыямі КНР, паміж гарадамі ствараюць падмурак сумеснага развіцця нашых краін, — сказаў Мікалай Снапкоў. — Дырэктыва мае прыкладны характар і вызначае канкрэтныя задачы па нарошчванні і паглыбленні супрацоўніцтва ва ўсіх сферах. Абласцям пастаўлены мэтавы арыенцір —- прыцягненне да канца пяцігодкі па $150 млн прамых інвестыцый ад кітайскіх інвестараў».

Першы віцэ-прэм'ер перакананы, што дырэктыва дасць канкрэтныя вынікі па ўсіх напрамках супрацоўніцтва: ад дасягнення экспарту да $2 млрд да 2025 года да стварэння сумесных мастацкіх фільмаў.

НАСУПЕРАК САНКЦЫЯМ

Санкцыйная палітыка заходніх краін стварае магутныя дадатковыя стымулы для дынамічнага развіцця знешнеэканамічных адносін з Кітаем. Такую думку выказаў БелТА дырэктар Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Васіль Гурскі.

«Гэты крок з'яўляецца лагічным працягам знешнеэканамічнай палітыкі нашай краіны ў адносінах не толькі з Кітаем, але і па ўсім усходнім вектары. Нявызначанасць знешнеэканамічнай кан'юнктуры, якая імкліва нарастае апошнім часам, санкцыйны ціск з боку ЕС і ЗША, наступствы пандэміі і іншыя фактары спараджаюць новыя эканамічныя і сацыяльныя рызыкі, выклікі і пагрозы для ўсіх краін без выключэння. Цалкам відавочна, што ў існуючых міжнародных умовах патрэба краін у канструктыўным узаемадзеянні і ўзаемнай падтрымцы істотна ўзрастае. Для Беларусі ўзрастае таксама аб'ектыўная патрэба геаграфічнай дыверсіфікацыі, а ў асобных выпадках — і пераарыентацыі экспарту. Палітыка заходніх краін і дружалюбныя адносіны ўсходніх суседзяў ствараюць магутныя дадатковыя стымулы для дынамічнага развіцця знешнеэканамічных адносін з Расіяй і Кітаем», — сказаў Васіль Гурскі.

«Разам з тым не толькі санкцыі Захаду прымушаюць нас глядзець на ўсход. Новыя цэнтры сілы, такія як Кітай, Індыя, Бразілія, Турцыя, Іран, дэманструюць апераджальны эканамічны рост. ВУП ЗША па парытэце пакупніцкай здольнасці з 2000 да 2020 года вырас у 2 разы, ВУП ЕС — у 2,1 раза, а ВУП Кітая прадэманстраваў рост у 6,6 раза, Расіі — у 4,1 раза, Індыі — у 4 разы, Турцыі — 3,9 раза. Ідзе перадзел рынкаў і сфер уплыву ў сусветнай эканоміцы», — звярнуў увагу эксперт. Паводле яго слоў, паказчык ВУП па парытэце пакупніцкай здольнасці характарызуе сукупны попыт у краіне, які ў сваю чаргу з'яўляецца сілай прыцягнення для гандлёвых патокаў і інвестыцый, драйверам інавацый. Аб'ём сукупнага попыту ў краіне вызначае глыбіню падзелу працы, якая з'яўляецца асноўным фактарам павышэння прадукцыйнасці, зніжэння сабекошту адзінкі прадукцыі, гэта значыць, галоўным фактарам далейшага эканамічнага росту, што і фарміруе сілу эканамічнага прыцягнення для краін-партнёраў.

АБНУЛІЛІ ЛІТВУ

Праўда, далёка не ўсе партнёры Паднябеснай праходзяць выпрабаванне часам. Адметна, што менавіта 3 снежня, калі ў Беларусі была падпісана Дырэктыва № 9, стала вядома, што Кітай выключыў Літву са сваёй мытнай сістэмы. У сувязі з гэтым літоўскія прадпрымальнікі больш не могуць размытніць свае тавары ў гэтай краіне, паведаміў партал Delfi. Як вядома, адносіны Літвы і Кітая пагоршыліся пасля таго, як у Вільнюсе адкрылася прадстаўніцтва Тайваня.

Перашкоды для траплення літоўскай прадукцыі ў Кітай пацвердзіла і Міністэрства замежных спраў Літвы. Яно сцвярджае, што будзе дабівацца рэакцыі ЕС на дзеянні Кітая. «Міністэрства інфармавана аб верагодных перашкодах для траплення літоўскай прадукцыі ў Кітай, мы падтрымліваем сувязі з літоўскімі прадпрыемствамі, збіраем усю магчымую інфармацыю з кітайскага боку аб абмежаваннях, якія ўводзяцца, а таксама кантактуем з Еўрапейскай камісіяй на прадмет рэакцыі на ўзроўні ЕС», — указаў МЗС у каментарыі для інфармацыйнага агенцтва BNS.

Прэзідэнт Літвы Гітанас Наўседа выказаў «шкадаванне» наконт дзеянняў кітайскіх мытнікаў. «Я спадзяюся, што ўрад, узважыўшы сітуацыю, падрыхтуе кампенсацыйныя сродкі, якія дапамогуць нашаму бізнесу пазбегнуць цяжкіх наступстваў», — сказаў Наўседа. А міністр эканомікі Аўшрынэ Армanайтэ параіла звярнуцца па заступніцтва да Еўрасаюза. Шэраг літоўскіх палітыкаў, не чакаючы дапамогі Бруселя, паспрабавалі самі арганізаваць дыялог з кітайцамі.

Прэзідэнт Літоўскай канфедэрацыі прамыслоўцаў Відмантас Янулявічус пацвердзіў BNS, што Літва была выкраслена з электроннай сістэмы мытнага дэкларавання Кітая. Генеральны дырэктар Гандлёвай асацыяцыі Літвы і Кітая Рокас Радвілавічус патлумачыў BNS, што афіцыйна ў Кітаі не паведамляецца, што блакіруюцца тавары з Літвы, аднак такія сігналы могуць накіроўвацца «на падставе ўнутраных указанняў».

АД ЗБОЖЖА ДА 5G

Паводле даных дэпартамента статыстыкі пры літоўскім Мінфіне, раней рэспубліка штогод прадавала ў КНР збожжа на 69,3 млн еўра, мэблі — на 38,7 млн, оптыкі, вымяральных інструментаў, медабсталявання — на 33,8 млн. Што датычыцца імпарту, то больш за ўсё ў Літву ўвозілася з Кітая электроннага абсталявання і яго састаўных частак — на 226 млн еўра, прадукцыі металапрацоўкі — на 143,1 млн, тэкстылю — на 104,7 млн.

«Літве КНР цікавая ў кантэксце як імпарту, так і экспарту, — лічыць літоўскі эканаміст Аляксандр Ізгародзін. — Агульны тавараабарот ацэньваецца ў 1,5 мільярда еўра». А эканаміст Марус Дубнікавас канстатуе, што без супрацоўніцтва з Кітаем Літве стане нашмат даражэй абыходзіцца ўкараненне і іншых тэхналагічных навінак, а таксама замена кампанентаў да высокатэхналагічных сістэм кітайскай вытворчасці, якія ўжо існуюць у рэспубліцы. «Гэтыя цяжкасці створаць дадатковыя праблемы мясцоваму бізнесу. Канкурэнтаздольнасць скароціцца», — папярэдзіў Дубнікавас.

Палітычны аналітык дырэктар Цэнтра па праблемах еўрапейскай інтэграцыі Юры Шаўцоў заўважыў, што гісторыя з выключэннем Літвы з мытнага рэестра Кітая цікавая далейшым развіццём. «Ці будзе Літва і яе суб'екты гаспадарання выключаныя ўвогуле з гандлёвых абменаў кітайскіх суб'ектаў гаспадарання па ўсім свеце? Адкуль яшчэ кітайцы выкрасляць Літву? Як гэта закране звычайных грамадзян Літвы? Размытніць яны тавары ўжо не могуць і асабіста? А якіх правоў яны пазбавяцца ў кітайскай экасістэме далей? Вельмі падобна на пілотнае тэсціраванне кітайскага глабальнага сацыяльнага рэйтынгу. Літва — краіна, мала звязаная з Кітаем. Любыя выдаткі такога тэсціравання для Кітая будуць не асабліва важныя. А калі гэтае выкрасліванне малой краіны са спіса краін, якія маюць правы на нешта ў эпоху глабальных big dates, стане эфектыўным?» — задаецца пытаннямі беларускі аналітык.

СТРАТЭГІЧНЫ ТРАНЗІТ

Некалькі месяцаў таму Кітай перакрыў транзіт праз Літву. Яшчэ ў жніўні чыгуначная кампанія China railway container transport corp. аб'явіла, што грузавыя перавозкі прыпыняюцца з прычыны неспрыяльнай палітычнай сітуацыі. Свае паслугі замест Вільнюса адразу ж прапанавала Варшава. Пазбавіўшы кітайскага транзіту Літву, кітайцы запусцілі новы чыгуначны маршрут у Польшчу. Варотамі на рынкі Еўрасаюза быў вызначаны Гданьск, а не Клайпеда, якая таксама была пазбаўлена беларускага транзіту.

Таму, калі Польшча анансавала магчымую блакіроўку чыгуначных зносін з Беларуссю, у Кітаі моцна ўстрывожыліся. Аб гэтым паведаміла выданне Global Times. Для шэрагу кітайскіх кампаній транзіт праз Беларусь у Еўропу жыццёва важны. Калі Варшава ажыццявіць сваю пагрозу і перакрые чыгуначныя зносіны, бізнес КНР адчуе на сабе наступствы адзін з першых. Справа ў тым, што больш за палову грузаў, якія ідуць па чыгунцы праз беларуска-польскую граніцу, — кітайскія. Прэзідэнт Shanghai EPU Supply Chain Management Co Томі Тан адзначыў, што цяпер больш за 300 грузавых цягнікоў з Кітая ідуць па гэтым маршруце. Калі транзіт будзе заблакіраваны, узнікне вялікая пробка. Паводле афіцыйных звестак, сёлета са студзеня да кастрычніка з Кітая ў Еўропу адправілася 12,6 тысячы грузавых цягнікоў. Прыкладна чвэрць агульных паставак КНР у Стары свет прыпадае на беларуска-польскі транзіт. Яго страта нават на непрацяглы час акажацца вельмі балючай для кітайскага бізнесу. Праўда, шэраг экспертаў лічыць, што закрыццё чыгуначных зносін паміж Польшчай і Беларуссю малаверагодна з эканамічных меркаванняў. Паколькі Варшава, якая моцна зайздросціць узроўню развіцця супрацоўніцтва Мінска і Пекіна, з усіх сіл імкнецца інтэграваць ў транснацыянальны «Пояс і шлях», каб атрымаць інфраструктурныя інвестыцыі перш за ўсё ў Паморскае ваяводства.

ІНФЛЯЦЫЯ І ПРАТЭСТЫ

Тым часам стала вядома, што літоўскі Саюз сем'яў да 22 снежня будзе штодня праводзіць у Вільнюсе каля сейма пікеты з-за «сегрэгацыі і дыскрымінацыі» насельніцтва і парушэння канстытуцыйных каштоўнасцяў. Аб гэтым паведаміў партал Delfi. Як адзначыў прадстаўнік літоўскага Саюза сем'яў, яны выступаюць супраць абавязковага тэсціравання работнікаў на COVID-19 за свой кошт, а таксама супраць «пашпарта магчымасцяў».

У сярэдзіне студзеня пікеты маюць намер праводзіць і каля будынка ўрада. Па рашэнні Кабміна Літвы, з 1 снежня работнікі пэўных сфер, калі яны не былі прышчэплены і не хварэлі на каранавірус, павінны рэгулярна тэсціравацца за свой кошт. «Пашпарт магчымасцяў» невакцынаваныя і няхворыя могуць атрымаць, толькі здаўшы ПЛР-тэст (тэст на антыгены ўжо не дзейнічае) за свой кошт, тэрмін яго дзеяння — 72 гадзіны з моманту здачы ўзору. Дзяржава фінансуе тэсціраванне толькі ў парадку выключэння людзям пэўных груп.

Дадатковым фактарам народных хваляванняў таксама стаў эканамічны крызіс. У лістападзе гадавая інфляцыя ў Літве склала рэкордныя 9,3 працэнта. Гэта найвышэйшы паказчык ва ўсім Еўрасаюзе. Прычына — рэзкі рост цэн на энергарэсурсы, тавары і паслугі. Эканамісты прагназуюць, што ў Літве ў найбліжэйшы час інфляцыя будзе двухзначнай.

Пётр ДУНЬКО.

У адказе за гістарычную памяць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Новая інфармацыя трапляе да нас кожны дзень, — расказаў аб ходзе расследавання генеральны пракурор. — Мы актыўна пачынаем працаваць у архівах Расійскай Федэрацыі: размова ідзе аб мільёнах аркушаў звестак аб злачынствах, якія здзяйснялі фашысты і іх памагатыя на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Завяршылі першапачатковыя работы ў Чонкаўскім лесе (Гомельскі раён. — **Рэд.**), дзе было знішчана не менш чым сто тысяч чалавек. Гэтае месца раней не фігуравала ў дакументах. Вядома ўжо каля 350 новых месцаў, дзе, як мяркуецца, знішчалі мірных грамадзян і ваеннаслужачых Чырвонай Арміі. Звесткі атрыманыя, у асноўным, са слоў відавочцаў і сведкаў.

Як адзначыў Андрэй Швед, вялікая работа праводзіцца і па ўстанаўленні матэрыяльнай шкоды, у тым ліку па ацэнцы тых каштоўнасцяў, якія былі вывезены фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. «Выконваючы даручэнне кіраўніка дзяржавы, фарміруем частку матэрыялаў для перадачы службовым асобам замежных дзяржаў і генеральным пракурорам Міжнароднай асацыяцыі пракуроры — гэта 183 краіны, — расказаў ён. — Кожны з генеральных пракуроры і тых службовых асоб, якія вызначыць кіраўнік дзяржавы, атрымае на англійскай і рускай мовах асноўныя агульныя звесткі аб маштабах, формах і метадах генадыцу, які ажыццяўляўся на нашай тэрыторыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

Акрамя таго, Генеральная пракуратура завяршае работу, звязаную з вызначэннем найменняў карных падраздзяленняў. Будуць вядомыя імёны фашыстаў і іх памагатых, якія, пачынаючы з ліпеня 1941 года, знішчалі на тэрыторыі Беларусі мірных людзей. «Гэтыя звесткі, як і многія іншыя, будуць перададзены грамадскасці, — акцэнтаваў увагу Андрэй Швед. — Гэта вельмі важна: усе павінны ведаць пайменна кожнага фашыста, у якога рукі ў крыві. Яшчэ адна з мэт расследавання — аналізуючы спісы карнікаў, устанавіць імёны тых, якія яшчэ жывыя. Сёння больш чым 400 фашыстаў жыве як мінімум у 17 краінах. Цяпер вырашаецца пытанне аб прыцягненні гэтых асоб да крымінальнай адказнасці. Мы павінны дамагчыся таго, каб хоць бы частка з іх паўстала перад судом. Гэта наш святы абавязак».

Улічваючы тое, што з кожным днём Генеральная пракуратура сумесна са Следчым камітэтам выяўляюць новыя факты злачынстваў у дачыненні да нашых суайчыннікаў, тэрмін следства сёння вызначыць немагчыма. Затое ўжо ў найбліжэйшы час, па словах генеральнага пракурора, трэба вызначыцца з тым, якія падыходы па выніках работы і якія першапачатковыя звесткі трэба актыўна выкарыстоўваць для вырашэння пытанняў па змене адукацыйнага працэсу, выхаваўчай і ідэалагічнай работы.

Адзін з рэальных крокаў у дадзеным кантэксце — законапраект аб генацыдзе беларускага народа, які ўжо хутка на чарговай сесіі разгледзяць дэпутаты. Як заўважыў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Лілія АНАНІЧ.** — Гэта важна таму, што мы ўбачылі сучасныя праявы генацыду ў дзеяннях ужо на беларуска-польскай і беларуска-літоўскай граніцах, калі правы чалавека, у тым ліку права на жыццё, калектыўным Захадам падвяргаецца сумненню. Мы ўбачылі, да чаго можа прывесці пагарджанне гістарычнай памяццю ва Украіне. Убачылі, што няведанне гісторыі, у тым ліку жудасных фактаў злачынстваў на нашай зямлі, прыводзіць да выкарыстання калабарантамі нацысцкай сімволікі. Гэтым законам мы кажам аб тым, што злачынствы, здзейсненыя нацыстамі і іх памагатымі на беларускай зямлі супраць савецкіх грамадзян, з'яўляюцца генацыдам, планавым масавым знішчэннем беларускага народа.

Як лічыць парламентарый, недапушчальнае публічнае адмаўленне генацыду. У хуткім часе ў Крымінальным кодэксе з'явіцца новы артыкул, які прадугледжвае пакаранне за публічнае адмаўленне генацыду, вельмі вялікімі тэрмінамі, калі гэта будзе здзейснена паўторна і з выкарыстаннем у тым ліку службовага становішча. Акрамя таго, праект закона накіраваны і на правядзенне вялікай работы па ўвекавечванні ахвяр генацыду беларускага народа. «Сёння ў нас шмат мемарыялаў і помнікаў, але адкрываюцца новыя старонкі гэтай жудаснай гісторыі, — дадала Лілія Ананіч. — Закон стане зыходным пунктам для прызнання генацыду беларускага народа і яго асуджэння сусветнай супольнасцю. Сёння мы, беларусы, нясём адказнасць за гістарычную памяць».

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

Знешні гандаль

МАЗ падпісаў кантракт на мільён

Як вядома, у канцы лістапада ў Ташкенце прайшоў аграрны форум «Узбекістан — Беларусь», прымеркаваны да правядзення беларускай экспазіцыі на выстаўках сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання UzAgroExpo і UzProdExpo. У рамках мерапрыемства было падпісана пагадненне аб пастаўцы беларускай тэхнікі ва Узбекістан і іншыя дакументы.

На сустрэчы быў абмеркаваны шырокі спектр пытанняў, якія датычацца гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх краін у сельскай гаспадарцы і вытворчасці прадуктаў харчавання, фінансавай падтрымкі экспарту тавараў і паслуг Беларусі ва Узбекістан, асаблівасці яе прасоўвання на мясцовым рынку, узаемадзеяння ў жывёлагадоўлі.

Мерапрыемства сабрала кіраўнікоў профільных міністэрстваў і ведамстваў Беларусі і Узбекістана, прадстаўнікоў беларускага і ўзбекскага бізнесу, навукова-адукацыйных і жывёлагадоўчых арганізацый, экспертаў аграпрамысловай галіны дзвюх краін.

Варта адзначыць, што ад Беларусі ў форуме прынялі ўдзел 17 кампаній, прадстаўленых у Нацыянальным павільёне Беларусі.

«Узбекістан — гэта стратэгічны партнёр Беларусі, з якім мы даўно працуем. Мы распрацавалі некалькі напрамкаў для супрацоўніцтва ў найбліжэйшай перспектыве. У першую чаргу гэта будаўніцтва і рэканструкцыя малочнатаварнага комплексу ва Узбекістане па беларускіх тэхналогіях. Узбекскія калегі зацікаўлены ў тым, каб іх спецыялісты ў аграрнай сферы павышалі кваліфікацыю ў беларускіх ВНУ. Акрамя гэтага, ім цікава супрацоўніцтва ў ветэрынарыі, вопыт развіцця цукровай галіны Беларусі», — адзначыў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксей Багданаў.

«Асабліва значэнне для Узбекістана мае галіна, якая з'яўляецца гонарам Беларусі, — механізацыя сельскай гаспадаркі. Трактары, культыватары ўжо працуюць на палях нашай краіны, аднак толькі ў асобных раёнах. І мы хочам, каб яны «бегалі» ва ўсіх рэгіёнах Узбекістана, таму што маюць добрыя якасць і кошт», — сказаў яго ўзбекскі калега Алішэр Тураеў.

У ходзе аграрнага форуму «Узбекістан — Беларусь» былі падпісаны выніковы пратакол 2-га пасяджэння ўзбекска-беларускай рабочай групы па сельскай гаспадарцы і харчовай прамысловасці, а таксама пагадненне паміж афіцыйным дыстрыб'ютарам Мінскага аўтамабільнага завода ва Узбекістане, кампаніяй «MAZ-TASHKENT» і прадпрыемствам «NURAFSHON MAXSUS TEXNIKA» аб пастаўцы прадукцыі машынабудавання на суму 1 млн долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

МАК выступіў з заявай у сувязі з пазіцыяй ЗША па дыпламатычным байкоце Гульняў-2022

Міжнародны алімпійскі камітэт выказаў сваю пазіцыю наконт дыпламатычнага байкоту зімовых Алімпійскіх гульняў 2022 года ў Пекіне з боку ЗША. Адпаведная заява была апублікавана на афіцыйным сайце МАК.

«Прысутнасць афіцыйных асоб і дыпламатаў — палітычнае рашэнне кожнага ўрада. МАК цалкам прызнае гэтае права, будучы палітычна нейтральным. Падтрымка спартсменаў і Алімпійскіх гульняў неаднаразова дэманстравалася на працягу апошніх месяцаў, у тым ліку рэзалюцыяй ААН, прынятай усімі 193 членамі арганізацыі на 76-й сесіі Генеральнай асамблеі ААН у Нью-Ёрку на мінулым тыдні. Рэзалюцыя заклікае... выкарыстоўваць спорт як інструмент для прасоўвання міру, дыялогу і прымірэння», — было адзначана ў заяве прэс-службы МАК.

Еўропу папярэдзілі аб вайне, калі Захад парушыць «чырвоную рысу» Пуціна

Еўропу чакае вялікая вайна, калі Злучаныя Штаты перасякуць «чырвоную рысу», пазначаную Расіяй, піша аглядальнік харвацкай газеты Advance Д. Мар'янавіч.

Паводле яго слоў, Кіеў мае права арыентавацца на Захад у культурным і эканамічным плане, наладжваць адносіны з Еўрасаюзам, але яму нельга станавіцца членам Паўночнаатлантычнага альянсу. Інтэграцыя ў НАТА прывядзе да таго, што вялізны ўчастак расійскай граніцы стане фронтам з варожым ваенным блокам.

Мар'янавіч таксама ўпэўнены, што некалькі неасцярожных рухаў пацягнуць за сабой узброены канфлікт у Еўропе, які звядзе на нішто ўсе яе дасягненні пасля Другой сусветнай вайны. Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн ужо зрабіў памылку, заявіўшы, што «не прымае расійскіх чырвоных рыс» па Украіне, заўважыў аўтар матэрыялу.

Сітуацыю на ўсходзе Еўропы ён параўнаў з Карыбскім крызісам 1962 года: тады свет апынуўся на граніцы катастрофы пасля ўзаемнага размяшчэння ядзерных амерыканскіх і савецкіх ракет у Турцыі і на Кубе адпаведна.

У ААЭ адмянілі выхадны ў пятніцу

Аб'яднаныя Арабскія Эміраты сталі першай мусульманскай краінай, якая адмовілася ад выхаднога дня ў пятніцу, гаворыцца ў рашэнні ўрада ААЭ, распаўсюджаным эмірацкім агенцтвам навін WAM.

Пятніца для мусульман з'яўляецца святым днём. Мусульмане вераць, што менавіта ў пятніцу Алах стварыў Адама, які ў гэты дзень увайшоў у рай, і ў гэты ж дзень быў выгнаны з яго, і Апошняя гадзіна не праб'е ні ў які іншы дзень, акрамя пятніцы.

У гэты дзень мусульманам належыць наведваць адмысловую малітву ў мячэцях і ўдзяляць час блізкім, таму ва ўсіх мусульманскіх краінах пятніца з'яўляецца выхадным днём, а рабочы тыдзень пачынаецца з нядзелі.

ВЫПІЎ, ЗАКУРЫЎ, ЗАСНУЎ, НЕ ПРАЧНУЎСЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Добруш пунктам прызначэння рэйда ратавальнікаў стаў невыпадкова. Не так даўно ў райцэнтры адбылося рэзананснае надзвычайнае здарэнне — гарэла кватэра ў адным са шматпавярховікаў. Асноўная версія прычыны пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні. Гаспадыню палаючай кватэры, на шчасце, выратавалі. Але ўсё магло скончыцца трагічна не толькі для жанчыны, але і для яе суседзяў, што мірна спалі той раніцай. З дома прыйшлося эвакуіраваць 12 чалавек, у тым ліку дваіх дзяцей. У пад'ездзе неабходны сур'ёзны рамонт.

Гэты адрас па маршруце назіральнай камісіі з удзелам супрацоўнікаў МНС у спіс наведвання ўключаны наўмысна. Пасля рэзананснага надзвычайнага здарэння да людзей лягчэй дастукацца, прыцягнуць іх увагу да праблемы. Адрасаты ўзмоцненай прафілактычнай работы — домаўладальнікі, якія злоўжываюць алкаголем, вядуць асацыяльны лад жыцця. Тым не менш на асаблівым кантролі ратавальнікаў і адзінокія старыя, інваліды, сем'і, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, шматдзетныя...

Па маршруце назіральнай камісіі ў Добрушы такіх адрасатаў некалькі. Гаспадыні прыватнага дома па вуліцы Гомельскай Надзеі Дзямковай пад 80. Жыве пажылая жанчына адна, зараз вырашаецца пытанне аб аказанні ёй надомнай сацыяльнай дапамогі. Ратавальнікі абследуюць печку і грубку. **Першы намеснік начальніка раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Павел ЛІПАЎ** тлумачыць:

— Пры праверцы домаўладанняў з пячным ацяпленнем абавязкова звяртаем увагу на стан печы. Яна павінна быць пабелена, атынкавана, без расколін. Гэта датычыцца і коміна. Правяраецца і стан дзверцаў, наяўнасць прытопачнага ліста. Правяраем, як складзены гаручыя матэрыялы, ці не размешчаны побач прадметы, якія могуць лёгка загарэцца.

Адрасаты ўзмоцненай прафілактычнай работы — домаўладальнікі, якія злоўжываюць алкаголем, вядуць асацыяльны лад жыцця. Тым не менш на асаблівым кантролі ратавальнікаў і адзінокія старыя, інваліды, сем'і, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, шматдзетныя...

У доме па вуліцы Чырвонаармейскай жывуць сваячкі Любоў Дзеева і Валянціна Сухіх. Адна з сясцёр — інвалід другой групы і прызнана недзеяздольнай. Раней камісія выяўляла ў хаце невялікія парушэнні: былі расколіны ў печы, прытопачны ліст маленькага памеру.

— Памятайце, што за дзве гадзіны да адыходу да сну трэба спыняць тапіць печ, — звяртаецца да гаспадынь **афіцыйны прадстаўнік Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Ксенія ШЫНГІРЭЙ** і папярэджвае: — Вам неабходна адсоўваць пры топцы печы далей дыван, каб вугольчыкі на яго не адскоквалі.

Заўвага — прама ў цэль, прызнаецца адна з сясцёр, паказвае на чорныя кропкі-сляды на дыване.

Па дзяржпраграме ў гэтым доме ўжо ўстаноўлены сігнальна-гукавая прылада з вывадам на фасад і аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Пасля праверкі прылад Ксенія Шынгірэй уручыла гаспадыням памяткі з правіламі эксплуатацыі пячнога ацяплення і выкарыстання электраабсталявання.

Чарговы пункт «маршрута бяспекі» — кватэра ў пяціпавярховіку ў мікрараёне Меліяратар. Гаспадыня жыла — Святлана Зенава. Раней яе сям'я трапіла ў статус «сацыяльна небяспечнага становішча». Паўгода дзеці Святланы правялі ў сацыяльна-педагагічным цэнтры, а гэтым летам вярнуліся да маці. Да сям'і зараз пытанняў няма. Мама выконвае ўсе рэкамендацыі.

У Добрушскім раёне з пачатку года адбылося 44 пажары — гэта на адзін выпадак больш у параўнанні з такім жа перыядам 2020-га. Колькасць загінулых зменшылася з 4 чалавек у мінулым да 2 сёлета. Колькасць траўміраваных выросла — з 2 да 3 чалавек.

Выклікае заклапочанасць ратавальнікаў і статыстыка надзвычайных здарэнняў у Гомельскім раёне. З пачатку года на пажарах тут загінулі 12 чалавек, 10 смяротных выпадкаў — з-за неасцярожнага абыходжання з агнём.

У Гомелі з пачатку года адбылося 100 пажараў, з іх палова — па той жа прычыне, што і ў раёне. Загінулі дзевяць чалавек, шэсць з якіх — з-за непатушанай цыгарэты.

Варта адзначыць, што прафілактычныя рэйды ў абласным цэнтры супрацоўнікі МНС праводзяць рэгулярна. Пачынаюць улетку, і калі выяўляюць парушэнні, то ўвосень паўторна правяраюць, ці ўсё выканана. Па выніках апошняга рэйду на тэрыторыі Гомеля спецыялісты МНС адзначылі, што ўсе выказаныя раней заўвагі адрасаты аглядальных камісій выправілі.

— Тыя раёны вобласці, якія, на жаль, «плюсуюць» па сумнай статыстыцы гібелі на пажарах, у першую чаргу адпрацоўваюцца падчас прафілактычных рэйдаў супрацоўнікаў Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, — падкрэсліла Ксенія Шынгірэй. — Звяртаем увагу жыхароў Гомельшчыны, што, нягледзячы на агульнае зніжэнне колькасці пажараў у параўнанні з мінулым годам, гібель людзей расце. З пачатку года на пажарах у рэгіёне загінулі 108 чалавек. Гэта больш чым на 20 % плюс да аналагічнага перыяду 2020 года. Варта адзначыць, што 95 чалавек — ахвяры менавіта неасцярожнага абыходжання з агнём, у тым ліку пры курэнні ў стане алкагольнага ап'янення.

Наталля КАПРЫЛЕНКА. Фота Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.

ШТО МОЖА ЗРАБІЦЬ КОЖНЫ З НАС

Каб прадухіліць самую частую прычыну пажараў

Сёлета сітуацыя з пажарамі пагоршылася на тэрыторыі ўсёй краіны. За 10 месяцаў гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага гібель людзей павялічылася на 8 %, загінула 513 чалавек (475 летась). Такія смерці абумоўлены тымі ж абставінамі, што і ад іншых знешніх прычын. Загінулыя, як правіла, нідзе не працавалі, вялі асацыяльны лад жыцця і злоўжывалі спіртным.

Рост сёлета назіраецца амаль ва ўсіх рэгіёнах краіны: колькасць загінулых у Брэсцкай вобласці павялічылася на 17 %, у Гомельскай — на 22 %, у Гродзенскай на — 18 %, у Магілёўскай — на 15 %, у Мінску — на 12 %. Па віне асоб, якія знаходзіліся ў алкагольным ап'яненні, у 2021-м загінула 276 чалавек — больш за палову ад агульнай колькасці. Прычым па Віцебскай вобласці гэты паказчык складае больш за 59 %, Гродзенскай — 61 %, Магілёўскай — 56 %.

Лічба пажараў за апошнія 10 гадоў па віне людзей у алкагольным ап'яненні ашаламляе — больш за 11 тысяч. У іх загінула 4579 чалавек, траўміравана 1611 чалавек. Найбольш частая прычына пажараў па віне п'яных адбылася з-за неасцярожнага абыходжання з агнём — больш за 80 %. У 84 % крыніцай агню стала непатушаная цыгарэта.

— Цяпер холадна на вуліцы, многія курцы не жадаюць выходзіць на ганак ці з пад'зда свайго дома, таму ў асенне-зімовы перыяд павялічваецца колькасць пажараў, — тлумачыць **памочнік міністра — прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — У краіне праводзіцца вялікая прафілактычная работа па недапушчэнні такіх трагедый. Найбольш эфектыўныя прамыя кантакты і размовы з такімі людзьмі. Што можа зрабіць кожны з нас? Калі ў вас ёсць такі сусед ці такі сваяк і вы ведаеце, што ён злоўжывае алкаголем, курыць у ложку, не будзе лішнім паразмаўляць з ім, звярнуць увагу на пытанні бяспекі. Канешне, мы не адабраем курэнне, але калі гэтую звычку нельга перамагчы, падумайце разам, як гэта зрабіць бяспечна. Калі людзі вядуць асацыяльны лад жыцця, пра гэта павінны ведаць супрацоўнікі МНС, праваахоўных органаў, выканкамаў, мясцовых органаў улады, каб у кожнай сітуацыі камісія разабралася і змагла знайсці падыход да канкрэтнага чалавека. Камусьці патрэбна дапамога, хтосьці пагодзіцца пераехаць на зіму ў домінтэрнат. Вельмі важна не быць раўнадушнымі, звяртаць увагу на такіх суседзяў.

«Калі ў вас ёсць такі сусед ці такі сваяк і вы ведаеце, што ён злоўжывае алкаголем, курыць у ложку, не будзе лішнім паразмаўляць з ім, звярнуць увагу на пытанні бяспекі».

З наступленнем халадоў закінутыя дамы і будынкі нярэдка становяцца прыстанішчам для людзей, якія злоўжываюць спіртным і вядуць асацыяльны лад жыцця. Тут таксама спецыялісты заклікаюць суседзяў не быць раўнадушнымі: калі вы ведаеце, што ёсць такое месца, дзе збіраюцца гэтыя людзі, паведаміце супрацоўнікам МНС або міліцыі. З імі працуюць у тым ліку і участковыя міліцыянеры.

Дарэчы, колькасць злачынстваў, здзейсненых у стане алкагольнага ап'янення, апошнім часам, наадварот, знізілася. За апошнія 10 гадоў іх колькасць памешылася ўдвая: калі ў 2011 годзе іх зарэгістравалі амаль 27 тысяч, то сёлета — 13 тысяч. У прыватнасці, зменшылася колькасць наўмысных цялесных пашкоджанняў, злачынстваў сексуальнага характару, крадзяжоў, рабаўніцтваў, крадзяжу транспартных сродкаў.

Аднак пры гэтым алкаголь застаецца асноўнай «рухальнай сілай» злачынстваў: у стане ап'янення здзяйсняецца большасць забойстваў і наўмыснага нанясення цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Пры гэтым колькасць злачынстваў на 100 тысяч насельніцтва ў сельскай мясцовасці перавышае такі паказчык у гарадах. Амаль 90 % крымінальных дзеянняў у дачыненні да членаў сям'і таксама здзейснены ў стане алкагольнага ап'янення.

Як паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Канстанцін РУЦ,** на прафілактычным уліку МУС знаходзіцца 16 тысяч асоб, якія злоўжываюць спіртным. Па ініцыятыве праваахоўнікаў суды прынялі больш за 300 рашэнняў аб абмежаванні дзеяздольнасці такіх асоб, якія ставяць сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча. За 10 месяцаў гэтага года ў ЛПП змешчана больш за чатыры тысячы п'яніц (на 25 % больш, чым летась). Пасля вяртання з ЛПП з імі праводзіцца работа па вяртанні да сацыяльнага жыцця, ім садзейнічаюць у працаўладкаванні, ідзе далейшая медыцынская рэабілітацыя, аднаўленне дакументаў.

Алена КРАВЕЦ.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

ОАО «БЕЛАРУСЬРЕЗИНОТЕХНИКА»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Беларусьрезинотехника»** (УНП 700069297), 213829, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, в лице управляющего Шпакова Олега Петровича.

Повторные электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019/6 в экономическом суде Могилевской области будут проведены **23 декабря 2021 г. с 09.00 до 16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 %	Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Воздушный ресивер 6000х2000 (20 куб. м) – 3 т, б/у, инв. № 10051122	5292,00	3528,00
2	Воздушный ресивер 6000х2000 (20 куб. м) – 3 т, б/у, инв. № 10051122	5292,00	3528,00
3	Воздушный ресивер 6000х2000 (20 куб. м) – 3 т, б/у, инв. № 10051122	5292,00	3528,00
4	Воздушный ресивер 5000х2000 (15 куб. м) – 2,5 т, б/у, инв. № 10051121	3456,00	2304,00
5	Воздушный ресивер 5500х1500 (10 куб. м) – 1,6 т, б/у, инв. № 10051124	3132,00	2088,00
6	Воздушный ресивер 3000х1000 (2,5 куб. м) – 0,6 т, б/у, инв. № 10051123	766,80	511,20
7	Емкость дюралевая с ложементами 9500х2600 (50 куб. м) – 2,1 т, б/у, инв. № 10051126	8424,00	5616,00
8	Емкость дюралевая с ложементами 9500х2600 (50 куб. м) – 2,1 т, б/у, инв. № 10051126	8424,00	5616,00
9	Емкость дюралевая с ложементами 9500х2600 (50 куб. м) – 2,1 т, б/у, инв. № 10051126	8424,00	5616,00
10	Емкость-миксер – 6000х2500 (30 куб. м) – 1,3 т., б/у, инв. № 10051128	1836,00	1224,00
11	Ресивер (цех №7) – 4500х1500 (22 куб. м) – 0,5 т, б/у, инв. № 10051118	5616,00	3744,00
12	Ресивер (цех № 7) – 4500х1500 (22 куб. м) – 0,5 т, б/у, инв. № 10051118	5616,00	3744,00
13	Валок заготовка 610х800, б/у, инв. № 10509166	7020,00	4680,00
14	Валок заготовка 610х800, б/у, инв. № 10509166	7020,00	4680,00
15	Валок заготовка 610х800, б/у, инв. № 10509166	7020,00	4680,00

Местонахождение предметов торгов – Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, тел. для ознакомления +375 29 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 09.12.2021 г. с 09.00 по 22.12.2021 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация». Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 календарных дней со дня завершения электронных торгов. Победитель торгов (претендент на покупку), обязан оплатить предмет торгов в соответствии с условиями договора купли-продажи, но не позднее 30 календарных дней, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: Ford Transit (легковой (вагон)), 2009 г. в., пробег 234 762 км, гос. № 1157 ЕС-4, цвет – темно-синий, разрешенная максимальная масса – 3000 кг.

Начальная цена продажи лота – 20 000 руб. (двадцать тысяч рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 2000 руб. (две тысячи рублей)

Продавец – дочернее унитарное предприятие «Проектный институт Гродногипрозем» республиканского унитарного предприятия «Проектный институт Белгипрозем»

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона: возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по оказанию услуг по независимой оценке транспортного средства в размере 181,50 руб.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов. Условия оплаты – по договоренности сторон

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB301205008332 25001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 27 декабря 2021 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 21.10.2021 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 23 декабря 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Городятичи-Агро»

Лот № 1:

ЗДАНИЕ РЕМОНТНОЙ МАСТЕРСКОЙ,

инв. № 643/С-15633, 601,3 кв. м, адрес: Минская обл., Любанский р-н, Малогородятичский с/с, 4, 300 м южнее д. Паличин, ул. Комсомольская, 6.

Начальная цена с НДС – 13 000,00 бел. руб.
Задаток – 6 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 8 %.

Аукцион состоится 11.01.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатков – 06.01.2022 в 11.00.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» объявляет о проведении повторных электронных торгов 2021.Ч.002.00050 по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by.

Продавец: открытое акционерное общество «Автомобильная транспортно-экспедиционная компания», г. Витебск, тел. +375 (212) 55-32-72.

Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов: **29.12.2021 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Грузовой седельный тягач MAZ-5440A9-1320-031, 2010 г. в., кузов (рама) № Y3M5440A9A0000423, цвет – темно-зеленый, рег. знак АЕ 4301-2. **Нач. цена**: 15840,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток**: 1584,00 бел. руб.
Лот № 2. Грузовой седельный тягач MAZ-5440A9-1320-031, 2010 г. в., кузов (рама) № Y3M5440A9A0000412, цвет – темно-красный, рег. знак АЕ 4175-2. **Нач. цена**: 14760,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 1476,00 бел. руб.
Лот № 3. Грузовой седельный тягач MAZ-5440A9 1320-031, 2011 г. в., кузов (рама) № Y3M5440A9B0001532, цвет – красный, рег. знак АЕ 6734-2. **Нач. цена**: 11120,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 1112,00 бел. руб.
Лот № 4. Полуприцеп бортовой тентовый MAZ 975830-3018, 2011 г. в., кузов (рама) № Y3M975830B0004660, цвет – черно-серебристый, рег. знак А 3559 А-2. **Нач. цена**: 8640,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 864,00 бел. руб.
Лот № 5. Грузовой седельный тягач МАЗ 5432 А5-323, 2008 г. в., кузов (рама) № Y3M5432A580000379, цвет – белый, рег. знак АВ 3111-2. **Нач. цена**: 10160,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 1016,00 бел. руб.
Лот № 6. Грузовой седельный тягач МАЗ 5432 А5-323, 2008 г. в., кузов (рама) № Y3M5432A580000366, цвет – белый, рег. знак АВ 2416-2. **Нач. цена**: 9760,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 976,00 бел. руб.
Местонахождение имущества: г. Витебск, ул. Терешковой, 11

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом ЭТП. **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, пройти аккредитацию на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах в порядке, размещенном на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 28.12.2021.** Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия повторных электронных торгов**: победитель электронных торгов (единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 10 календарных дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, возместить затраты по оценке предмета электронных торгов, оплатить услугу по размещению одного аукциона и обслуживанию ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; заключить договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 календарных дней со дня проведения электронных торгов после возмещения затрат на организацию и проведение электронных торгов, затрат по оценке, услуг по ЭТП; оплатить НДС сверх цены продажи предмета электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, предусмотренные договором купли-продажи. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by в разделе: «транспорт». Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 649-62-46.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ»– управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ» (Продавец)

Лот № 1: ЗДАНИЕ ГАМБУРГЕРНОЙ (литер У 1/м-к) с инв. № 500/С-31002, 757 кв. м.

Адрес: г. Минск, ул. Корженевского, 16/9.
Обременения: аренда.

Начальная цена с НДС – 865 190,04 руб.
Задаток – 85 000,00 руб. **Штраф** – 50 000,00 руб.

Земельный участок с кадастровым номером 500000000004006953 площадью 0,2543 га. Право аренды. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Аукцион состоится **23.12.2021 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск ул. Романовская Слобода, 8, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **21.12.2021 в 11.00**.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (организатор аукциона) извещает о проведении 12 января 2022 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь (га)	Ограничения в использовании, инфраструктура	Начальная цена (бел. рублей)	Размер задатка (бел. рублей)	Расходы по изготовлению документации (бел. рублей)
1	**д. Олешники, 623287600101000055,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,2500	Черта населенного пункта. Имеются сети: электрификация, водоснабжение	4800,00	960,00	Расходы за размещение объявления
2	**д. Молоди, пер. Лесной, д. 8Б, 623287605101000371,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,0944	Черта населенного пункта. Имеются сети: подъездные пути, водоснабжение	3000,00	600,00	2763,21 + расходы за размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона 12 января 2022 в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, Швабский сельский исполнительный комитет.

Контактные телефоны: **8 (01774) 59 1 35, 59 2 35; (+37529) 1071617.**

Прием документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 (кроме субботы и воскресенья) по 06.01.2022 включительно.

Для участия в аукционе необходимо:

1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;
2. представить квитанцию об уплате суммы задатка;
3. представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;

заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Задаток перечисляется на р/с № BY21AKBB36006191611010000000, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, г. Логойска. УНП 600537220, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901.

Условия: аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Ориентировочная сумма затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку», в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» составляет:

1. д. Олешники, составляет: ориентировочно – 14549,75 бел. руб. (сети электроснабжения ориентировочно – 9768,00; объекты транспортной инфраструктуры – 4781,75);
2. д. Молоди, пер. Лесной, д. 8Б, составляет: 11573,65 бел. руб. (сети электроснабжения ориентировочно – 9768,00; объекты транспортной инфраструктуры – 1805,65).

ИЗВЕЩЕНИЕ

Республиканское унитарное предприятие «Комплекс по оказанию услуг имени П. М. Машерова»

уведомляет о проведении 28.12.2021 г. аукционных торгов по продаже права заключения договора аренды на три года объекта общественного питания

(кафе «Спадчына»)

площадью 647,58 кв. метров по пр. Победителей, 23/1-1 в г. Минске,

проводимых в электронной форме на электронной торговой площадке «ТОРГИБЕЛ».

С полной информацией можно ознакомиться на сайтах: **http://торги.бел** (Номер лота: 261121001) **https://au.nca.by/item/52956**

Телефоны для справок:
(РУП «Институт недвижимости и оценки»)
(017) 306-00-57, (029) 550-09-70;
(РУП «Комплекс по оказанию услуг имени П. М. Машерова»)
(017) 306-47-34.

УНП 192240128

Считать недействительным утерянный ЗАО «СК «Белросстрах» бланк страхового полиса «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ № 1870231. УНП 100782388

Эканамікс

«ЛІЧБА» ЯК ДРАЙВЕР ДЛЯ ГЛЫБІНКІ

У Віцебску адбыўся дзявяты міжнародны эканамічны форум «Інавацыі. Інвестыцыі. Перспектывы». У ім узялі ўдзел прадстаўнікі каля пятнаццаці краін свету. Сярод іх бізнесмены, эксперты, дыпламаты.

На Віцебскім эканамічным форуме.

Сёлетні прыярытэт — лічбавая эканоміка. Яна закліканая стаць драйверам для інавацыйнага развіцця рэгіёна. Мерапрыемства, арганізаванае аблвыканкамам, доўжылася два дні і прайшло ў гібрыдным фармаце.

Старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Мікалай ШАРСНЁЎ ад імя выканаўчай «вертыкалі» гарантаваў падтрымку інвестарам на ўсіх этапах. Ён паведаміў пра багаты вопыт рэалізацыі на поўначы краіны смелых і часам нечаканых ідэй. Падкрэсліў гатоўнасць сумесна выпрацоўваць найбольш эфектыўныя тэхналагічныя і арганізацыйныя рашэнні.

Сёлета ў развіццё эканомікі Віцебшчыны ўкладзена каля 2,7 мільярда рублёў, створана больш за тры тысячы рабочых месцаў. Запушчана інавацыйная вытворчасць у сферы машынабудавання, дрэваапрацоўкі, аграрным бізнесе. Вельмі цеснае і плённае супрацоўніцтва развіваецца з расіянамі.

Кіраўнік расійскага горада Пскоў Алена ПАЛОНСКАЯ, якая прыехала ў Віцебск для ўдзелу ў форуме, пацвердзіла гэта. Партнёрства Пскова з беларускім бокам вядзецца больш за дваццаць гадоў. «Мы знаходзімся на важным этапе развіцця расійска-беларускіх адносін, — сказала яна. — Інтэграцыйны працэс найперш накіраваны ў эканамічную сферу». Мэр Пскова нагадала пра неабходнасць выканання каля трыццаці «дарожных карт», якія нядаўна былі зацверджаны краінамі на самым высокім узроўні. А гэта значыць, неабходныя новыя падыходы да супрацоўніцтва, трэба павялічыць колькасць інвестыцыйных праектаў як для буйнога бізнесу, так і для малога. Віцебская бізнес-пляцоўка, лічыць расіянка, вельмі зручная для абмеркавання новых падыходаў і формаў узаемадзеяння.

Міністр эканомікі Беларусі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ расказаў, што ў новай пяцігодцы ключавы напрамак развіцця эканомікі — інвестыцыі ў рэгіёны. Міністэрства сфарміравала план па тэме праектаў на суму больш за 50 мільярдаў рублёў. Іх колькасць перавышае тысячу: ад маленькіх — з укладаннямі на мільён рублёў, да буйных, дзе размова ідзе пра мільярды. І гэта датычыцца толькі камерцыйных праектаў. Патрэбнасці інвестыцый у сацыяльную, транспартную і вытворчую інфраструктуру ацэньваюцца ў 30 мільярдаў рублёў.

Прадстаўнік беларускага ўрада напомніў формулу паспяхаванага развіцця глыбінкі, якую агучыў на мінулым Усебеларускім народным сходзе кіраўнік дзяржавы: у абласцях неабходна мінімум па адным буйным вытворчым інвестпраекце, у раёнах — няхай ён будзе не такі вялікі, але таксама мінімум па адным праекце з прыцягненнем капіталу. Міністр нагадаў пра сённяшнія змены ў свеце, якія ўплываюць на інвестыцыйна-таварныя патокі. У прыватнасці, разрываюцца традыцыйныя лагістычныя ланцужкі па многіх кірунках, час паставак падаўжаецца. Яшчэ адзін сучасны трэнд: узмацненне рэгіяналізацыі ў атрыманні дабаўленай вартасці, калі ўсё больш кампаній па ўсім свеце хоча лакалізацыі вытворчасцяў на мясцовай сыравіне і камплектуючых. Менавіта гэта, па словах міністра, прыводзіць да росту цэн, які назіраецца ў свеце.

На думку міністра, удзел у беларускіх кластарах — вельмі выгаднае бізнес-мадэль для патэнцыйных інвестараў. У Падзвінскім краі могуць зацікавіць укладанні ў фармацэўтычны, нафтахімічны, дрэваапрацоўчы кластары. Асобная тэма — прывабнасць развіцця турызму, улічваючы ўнікальнасць прыроды Віцебшчыны, значную колькасць цікавых аб'ектаў архітэктуры, адметных фестываляў.

З тым, што можа прапанаваць паўночны рэгіён у сэрвісе, перапрацоўцы драўніны, адукацыі, абароне, можна было азнаёміцца ў кулуарах форуму. Вялікі інтарэс выклікала інфармацыя пра прэферэнцыі тэрыторыі СЭЗ «Віцебск». Пасля форуму засталася магчымасць пачаць супрацоўніцтва на электроннай пляцоўцы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.

З добрым сэрцам

«КАЗКА АД БАБУЛІ» І «ЁЛКА ЖАДАННЯЎ»

Дапамагчы адзінокім старым, даставіць ім рэцэпты і прадукты дамоў, прыбраць снег, расчысціць двор, сагрэць бяздомных у маразы, арганізаваць свята дзецям-сіротам ці маленькім пацыентам, што апынуліся ў медыцынскіх стацыянарах.... Фронт работ у валанцёраў — надзвычай шырокі. А ёсць жа яшчэ і спартыўнае, і культурнае, і экалагічнае валанцёрства...
Толькі пры Беларускім таварыстве Чырвонага Крыжа летась дзейнічала больш за 16 тысяч валанцёраў.

— Гэта людзі рознага ўзросту (хоць маладых сярод добраахвотнікаў, вядома, больш), розных прафесій, з рознай адукацыяй і сацыяльным статусам, але іх усіх аб'ядноўвае адно жаданне — аказваць дапамогу іншым, быць карыснымі, — падкрэслівае **спецыяліст аддзела медыка-сацыяльнай работы гэтай арганізацыі Святлана АНАЦКА.** — Кожны знаходзіць від дзейнасці па сваіх магчымасцях і інтарэсах. Між іншым, для таго каб павысіць якасць жыцця адзінокага чалавека, нярэдка дастаткова проста яго наведаць, пагутарыць з ім, пагартаць яго сямейны альбом. Звычайныя чалавечыя стасункі сёння ў вострым дэфіцыце.

— З кожным годам валанцёрскі рух пашырае маштабы. Аднак такая дзейнасць часта мае стыхійны характар, — канстатуе **кіраўнік Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра Вікторыя ЗАХАРЭЎСКАЯ.** — Таму наш цэнтр, акрамя рэалізацыі праектаў, якія сталі ўжо традыцыйнымі, займаецца яшчэ і інфармацыйна-тлумачальнай работай. Напрыклад, у лістападзе ў сацыяльных сетках стартаваў інфармацыйна-асветніцкі праект «Пра валанцёрства». Плануецца, што кожны месяц будзе прысвечаны пэўнаму кірунку валанцёрскай дзейнасці. У снежні ў цэнтры ўвагі будзе дапамога дзецям. Так, з 8 снежня сумесна з Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатрам імя Максіма Горкага правядзём дабрачынныя паказы спектакляў для дзяцей з сацыяльных устаноў і маламаёмасных сем'яў. Актыўна ў мерапрыемстве задзейнічаем валанцёраў. Яны будуць не толькі суправаджаць юных гледачоў, але і праводзіць для іх забаўляльную праграму перад пачаткам паказу.

6 снежня стартавала традыцыйная дабрачынная акцыя «Ёлка жаданняў».

14 снежня ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі стартуе рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы дзеці».

— Хачу адзначыць, што ўстановы адукацыі актыўна ў ёй удзельнічаюць. У школах пад дэвізам «Калядны падарунак: дзеці — дзецям» усе могуць далучыцца да збору падарункаў для дзяцей сацыяльна неабароненай катэгорыі, — кажа **спецыяліст упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Беларусі Таццяна РУБАНІК.** — Актыўна ў такую работу ўключаюцца і вышэйшыя навучальныя ўстановы: БДПУ, БДУІР, БДЭУ, БНТУ, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Студэнты не толькі віншуюць выхаванцаў дзіцячых дамоў і сацыяльных прытулкаў з навагоднімі святамі, але і арганізоўваюць для іх паказы.

А 6 снежня стартавала традыцыйная дабрачынная акцыя «Ёлка жаданняў», якую праводзіць Беларускі Чырвоны Крыж. Мэта кампаніі — павіншаваць са святам дзяцей, якія знаходзяцца ў складаным жыццёвай сітуацыі: са шматдзетных, няпоўных сем'яў, дзяцей з інваліднасцю.

Каманда Беларускага Чырвонага Крыжа адрасна сабрала жаданні дзяцей і дадаткова сфарміравала спіс сюрпрызаў — падарункаў для тых, хто не загадваў жаданняў ці чыіх жаданняў мы не ведаем.

У гандлёвых і бізнес-цэнтрах, атэлях і арганізацыях устаноўлены навагоднія ёлкі, упрыгожаныя паштоўкамі з жаданнямі і сюрпрызамі. Кожны з нас, убачыўшы такое святочнае дрэўца, можа купіць падарунак, які згадваецца ў паштоўцы, і пакінуць яго ў інфацэнтры крамы, на стойцы рэгістрацыі гатэля, перадаць супрацоўніку ўстановы, у якой устаноўлена ёлка, або валанцёру Чырвонага Крыжа. Пазней яго абавязкова даставяць дзіцяці. Узяць удзел у дабрачыннай кампаніі можна, і зрабіўшы ахвяраванне на сайце — donation.redcross.by/elka або праз сістэму плацяжоў АРІП.

Як паведаміў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай АРОЛ,** у полі зроку яго ведамства знаходзяцца валанцёры, якія дзейнічаюць пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, а таксама добраахвотнікі, якія дапамагаюць пажылым і інвалідам ад імя ўстаноў адукацыі, грамадскіх (БРСМ, «Белая Русь», БСЖ і інш.) і рэлігійных арганізацый.

Пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання валанцёры задзейнічаны па розных напрамках, у тым ліку праводзяць прафілактычную і тлумачальную работу з насельніцтвам.

Асаблівая роля ў такой дзейнасці адведзена валанцёрам «сярэбранага ўзросту» для якіх актыўны ўдзел у жыцці грамадства з'яўляецца крыніцай маральнага задавальнення, магчымасцю пашырыць сацыяльныя кантакты, быць запатрабаванымі. І ўсё гэта ў сукупнасці — адзін з падмуркаў актыўнага даўгалецця.

«Каб павысіць якасць жыцця адзінокага чалавека, нярэдка дастаткова проста яго наведаць, пагутарыць з ім, пагартаць яго сямейны альбом. Звычайныя чалавечыя стасункі сёння ў вострым дэфіцыце».

«Асноўныя напрамкі дзейнасці гэтых валанцёраў — фарміраванне і прапаганда здаровага спосабу жыцця (заняткі фізічнай культурай, пазнавальныя мерапрыемствы аб здаровым харчаванні і г. д.), навучанне па прынцыпе «роўны навучае роўнага» (лекцыі, заняткі, гурткі па інтарэсах, клубы, навучанне камп'ютарнай грамаце), арганізацыя культурных і спартыўных мерапрыемстваў, а таксама, вядома, наведванне адзінокіх пажылых і інвалідаў дома, аказанне ім маральнай падтрымкі і даступнай сацыяльна-бытавой дапамогі», — расказаў Мікалай Арол.

Напрыклад, у Аршанскім раёне створана некалькі валанцёрскіх службаў: мабільныя брыгады, якія інфармуюць аб правілах пажарнай бяспекі, служба па дзённым доглядзе (адрасна вырашае бытавыя пытанні тых, хто мае патрэбу), служба здароўя (прапаганда здаровага спосабу жыцця), адукацыйная (арганізацыя лекцый, майстар-класаў) і г. д. Пажылыя валанцёры таксама ўдзельнічаюць у праекце «Казка ад бабулі» — чытаюць казкі дзецям у дзіцячых садках Оршы.

«Наогул пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва дзейнічае каля 2,5 тысячы такіх грамадзян», — удакладніў Мікалай Арол. А прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый, якія таксама дапамагаюць сацыяльнай службе клапаціцца аб яе падапечных, — каля 7,6 тысячы чалавек.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дарогамі малой радзімы

«ТРЭБА ВЕДАЦЬ — СЭРЦА ПРОСІЦЬ»

Як музей у Вайцяшыне бібліятэку ад закрыцця выратаваў

Бібліятэк, што функцыянуюць не ў цэнтральных сядзібах, не ў аграгарадках, а ў значна меншых населеных пунктах, ужо амаль не засталося. Тым больш цікава было наведаць такую. Побач — цэнтр гаспадаркі і сельсавета, вёска Пескі, там ёсць Дом культуры і бібліятэка. А бібліятэка ў Вайцяшыне таксама жыве і не памяншае колькасць чытачоў ды наведвальнікаў.

ГРАМАДСКІ — ЗНАЧЫЦЬ, НАРОДНЫ

Варта сказаць, тут бываюць не толькі чытачы, але і наведвальнікі-экскурсанты, бо 20 гадоў таму бібліятэка стала музеем. Ды такім, што некаторым яго экспанатам нават раённыя краязнаўчыя музеі могуць пазайздросціць. А работа, якая тут праводзіцца, не раз станавілася нагодай для правядзення семінараў, крыніцай навучання калег, абмену вопытам. Так сталася, што згаданы музей зрабіўся справай жыцця Лідзіі РУДЗЬМАН. Лідзія Іванаўна хутка ўжо сорак гадоў як працуе ў гэтым будынку: спачатку бібліятэкарам пачатковай школы, а калі школу закрылі, проста бібліятэкарам.

Больш за два дзесяцігоддзі таму, на адной з раённых нарад бібліятэчных работнікаў папрасілі падрыхтаваць і прадставіць праграму развіцця сваіх устаноў. Вось тады яна і прапанавала адкрыць тут музей. І ўладкавала яго без капейкі бюджэтных сродкаў, але з падтрымкай мясцовай улады, тутэйшых сельгаспрадпрыемстваў, а галоўнае — простых людзей, вяскоўцаў, якія падтрымалі ідэю і панеслі рэчы з гарышчаў і бабуліных куфраў, падзяліліся дакументамі і ўспамінамі.

— Людзі з Вайцяшына і суседніх вёсак адносяцца да майго закліку з павагай, — расказвае Лідзія Іванаўна. — Яны аддавалі часам самае дарагое, тое, што доўгія гады лічылі сямейнай рэліквіяй. І цяпер заходзяць, цікавяцца, якое пачэснае месца заняў экспанат, ці карыстаецца ён цікавасцю наведвальнікаў. А некаторыя выказваюць апаску, маўляў, ты пойдзеш на пенсію, а музей паступова згасне. Дык я запэўніваю, што на маё месца прыйдзе нехта малады і справу падтрымае. А калі толькі збіралі і афармлялі экспазіцыю, — з усмешкай працягвае захавальніца музея, — ну ніхто не адмаўляў у дапамозе, бывала, патрабавалася тэрмінова паліцу ці стэнд прыбіць да сцяны, дык на вуліцу выбегу, першага, каго сустрэну, папрашу, і дапамагалі. Нездарма ж музей назвалі грамадскім, што ў дадзеным выпадку з'яўляецца сінонімам народнага.

ЧАМУ ВУЧЫЦЬ ГІСТОРЫЯ ПУСЛОЎСКІХ

Цяпер музей стаў найлепшым месцам для правядзення асветніцкай работы, якой у той ці іншай меры займаюцца ўсе бібліятэкі. Найбольш, вядома, Лідзія Рудзьман займаецца з дзецьмі. Краязнаўчыя экскурсіі звычайна пачынаюцца з вялікай залы, дзе размешчаны макет сядзібнага дома Пуслоўскіх. Усе ведаюць Косаўскі палац Пуслоўскіх. Але іх радавое гняздо тут, недалёка, у Песках. Захаваўся нават сядзібны дом. У цэнтры музейнай экспазіцыі — макет дома, зроблены брэсцкімі студэнтамі. Надзвычай цікавая гісторыя апошніх гаспадароў сядзібы — Францішка і Ірэны Пуслоўскіх, якія жылі тут да 1939 года. Гаспадыня штогод арганізоўвала нешта накшталт летняга лагера для вясковых дзяцей. Былі яны, несумненна, людзьмі прадпрымальнымі, у вакольцы развівалася прамысловасць, працавала шмат невялікіх прадпрыемстваў. Пра тое, як адукаваныя, культурныя людзі трапілі аднойчы пад уплыў махляроў, доўгія гады яшчэ расказвалі старажылы. Махляры і прайдзісветы, аказваецца, былі ва ўсе часы. Мясцовая пагалоска сведчыла, што тыя жулікі валодалі нейкімі чарамі і выманьвалі грошы з гаспадароў асаблівым спосабам, бо нават калі па заяве сялян (!) тых зламысніка прыцягнулі да судовага разбору і знайшлі пры іх шмат грошай, Францішак сказаў, што грошы і каштоўнасці перадаў добраахвотна. Прынамсі, так бывае, цяперашнім віртуальным зладзеям таксама нярэдка пераводзяць сродкі добраахвотна. Вось гэты факт Лідзія Іванаўна абавязкова падкрэслівае ў сваіх экскурсіях.

Не забывае нагадаць і пра тое, як нельга варушыць прах людзей. Пасля ўсталявання савецкай улады ў 1939 годзе вайскоўцы спрабавалі выкарыстаць капліцу-пахавальню Пуслоўскіх пад склад зброі, але неўзабаве салдаты сталі адмаўляцца заступаць на варту. Паводле іх слоў, уначы з'яўлялася жанчына ў белым, палохала іх. Тады гэты магільны склеп узарвалі. Хто з мясцовых жыхароў удзельнічаў у рабаванні склепа, доўга не пражыў і шчасця не займеў. А ў наш час на тым месцы чамусьці вырашылі паставіць газаразмеркавальную станцыю, дык супрацоўнікі яе пачалі заўважаць паранармальныя з'явы: то дзверы самі адчыняліся, то крэслы ў памяшканні рухаліся. Калі запрасілі святара і памяшканне асвяцілі, гэтыя з'явы зніклі.

Лідзія РУДЗЬМАН каля макета сядзібы Пуслоўскіх.

ГУЛЬНЯ: ЗНАЙДЗІ ПРАДЗЕДА

Найбольшай цікавасцю малодшых школьнікаў карыстаецца раздзел музея пра лясную партызанскую школу. Тут ёсць макет шалаша, макет зямлянкі, бытавая партызанская атрыбутыка. Дзеці любяць займацца ў «лясной школе», з задавальненнем пішуць вугольчыкамі, лічаць на шышках, пяюць «Кацюшу». Тут ёсць фотазона, дзе наведвальнікі робяць сэлфі.

Ваенным падзеям прысвечана вялікая частка музея. Калі дваццаць гадоў таму на стэндзе ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны было 48 здымкаў, цяпер іх нашмат больш. Адкрываюцца новыя імёны, новыя старонкі гісторыі. Гаворка ідзе, вядома, пра тутэйшых людзей.

— Сёлета на канікулах прыйшлі дзеці малодшага школьнага ўзросту, двайняткі — хлопчык і дзяўчынка, сказалі, што хочуць знайсці свайго прадзеда, — згадвае бібліятэкар. — Папытала, як прозвішча. Малыя назвалі — Вярынчык. Падвяла іх да стэнда з партрэтамі ўдзельнікаў вайны, і яны знайшлі. Больш за тое, у музеі ёсць франтавыя пісьмы іх прадзеда Вярынчыка. Гэта было ў суботу, а ў нядзелю з'явілася ўся іх вялікая сям'я. Дзядуля з бабуляй тых двайнят сказалі, што ўнучка праходу не дала, пакуль не выбраліся на вялікую сямейную экскурсію. Прыехалі ўсе, каб яшчэ раз паглядзець на партрэт продка, пачытаць матэрыялы пра яго. А тое дзяўчо само хадзіла па залах і само расказвала сваім сямейнікам, для мяне гэта нібы бальзам на душу, — падсумавала Лідзія Іванаўна. — І цяпер не раз пачынаю аповед для малых з прапановы знайсці на стэндзе здымак прадзеда.

Тут ёсць матэрыялы пра франтавікоў, выхадцаў з Вайцяшына і ваколіц. Напрыклад, такіх як генерал-лейтэнант Любарскі, што нарадзіўся ў Песках. Ёсць раздзел, прысвечаны землякам — воінам-інтэрнацыяналістам.

«АПРАНАЛІ ШТО? ЯКОЕ?»

Этнаграфічныя залы — асаблівая фішка бібліятэкара-экскурсавода. З дзяцінства Ліда была цікаўнай дзяўчынкай. Да мамы некалі хадзілі сталыя жанчыны, расказвалі розныя гісторыі часоў сваёй маладосці. «І вось гэтыя гісторыі я цяпер расказваю, каб экскурсія была жывая, яркая, вобразная, — кажа Лідзія Іванаўна. — Тут і сені, і камора, і пакоі гаспадарскія. У сянях і каморы процьма інструментаў і будаўнічых матэрыялаў, якімі карысталіся нашы папярэднікі.

Доўгую пілу, якую гаспадыня гэтых скарбаў памятае з дзяцінства, яна доўга шукала, ды нарэшце знайшла: цяпер піла стаіць каля сцяны. Пастка для мышэй нагадвае маленькую гільяціну. Ёсць нават разак, якім можна з калодкі выдзеўбці начоўкі. Нясуць людзі ліхтары, нажніцы, прынеслі нават ключ-нацягач, якім можна нацягваць абручы на посуд. А вось прыстасаванне для памолу збожжа нечым нагадвае ступу Бабы-Ягі. А малым на экскурсіі Лідзія часам кажа: «Бабуля-Яга ступу ў музей мне аддала, а сама на «мерседэс» перасела, так што ніколі не сядайце ў чужыя машыны да незнаёмых людзей». Маска-шчыток для зваркі, якую выкарыстоўвалі пры будаўніцтве Бярозаўскай ДРЭС, цяпер рарытэт.

У зале з адзеннем звяртае на сябе ўвагу стары абутак. Чаравічкі, якім больш за сто гадоў, аказваецца, падбітыя драўлянымі цвікамі, цвікі тады рабілі з бярозы. Снягоўцы рабілі з гумы, ёсць нават выемка для абцаса. Баба Паўліна падарыла музею свае снягоўцы, зробленыя з пакрышкі. Амаль ніхто з першага разу не адгадвае прызначэнне аднаго прадмета, які з'яўляецца... прыстасаваннем, каб зручна здымаць боты.

Ёсць паліто з авечай шэрсці, паясы для мужчын, народныя касцюмы, куфэркі з вышытымі адмысловымі ўзорамі ручнікамі, характэрнымі толькі для гэтай мясцовасці. Лялька ў калысцы перавязаная чырвонай стужкай, бо менавіта так спавівалі малых дзяцей. А дэвізам калекцыі могуць служыць словы Петруся Броўкі, змешчаныя навідавоку:

Трэба ведаць — сэрца просіць,
Як дзядам, бацькам жылося...
Трэба ведаць і пра тое,
Апраналі што? Якое?

РАЗУМНЫ ЯК КРОНЬКАВА ГУСЬ

Усё гэта расказваецца і паказваецца разам з гісторыямі людзей, што падарылі экспанаты, альбо іх бацькоў, аднавяскоўцаў, тлумачацца прыказкі і прымаўкі, мясцовыя показкі. Ну напрыклад, тут кажуць: «Разумны як Кронькава гусь». Хто такі Кронька і чым так вызначылася яго гусь? Старыя людзі расказвалі, што было гэта тады, калі да аднаго калодзежа хадзіла шмат гаспадароў. А зімой вакол студні ўтваралася вялікая наледзь, часам з даволі высокай горкай. Дык вось гусі не раз не надта зграбна коўзаліся на тым катку, бывае, падалі. Адна ж гусь, трапіўшы на ледзяную горку, не разгубілася, прысела і важна з'ехала ўніз. Так і ўвайшла ў гісторыю вёскі, увекавечыўшы мянушку гаспадара.

У бібліятэку-музей прыходзяць вучні мясцовай школы; сюды на заняткі прыводзіць выхаванцаў нядзельнай школы святар айцец Уладзімір Глушак, тут праходзяць святы, сходы, іншыя значныя падзеі вёскі. Яшчэ некалькі гадоў таму з Мінска студэнты прыязджалі цэлымі экспедыцыямі, запісвалі гісторыі, песні, легенды, цікавіліся фальклорам. Ім не раз перадавалі запісы песень, што захоўваліся ў архіве музея.

А бібліятэка мае пастаяннае кола чытачоў. Запісныя не толькі з Вайцяшына, але і з Белаазёрска, Бярозы, Пескаў, Ярцавіч, іншых населеных пунктаў. «Наша бібліятэка мае шмат літаратуры па краязнаўстве, яе я збірала ўсе гады. Чытачы гэта ведаюць, асабліва тыя з іх, хто цікавіцца тэмай. Прыходзяць, калі трэба напісаць рэферат ці іншую работу па гісторыі малой радзімы, пра яе мінулае і людзей, — кажа Лідзія Іванаўна. — Цяпер у сувязі з пандэміяй пажылыя людзі стараюцца менш выходзіць, дык ім літаратуру нават з паштальёнам перадаю, часам сама нашу кнігі».

Аляксандр ШЫМЧУК, старшыня Пескаўскага сельскага Савета, сказаў так:

— Музей-бібліятэка ў Вайцяшыне — гэта наша скарбніца народнай культуры. Тут праходзілі самыя розныя семінары, сустракалі самых розных, у тым ліку замежных, гасцей. Раней турфірмы падвозілі наведвальнікаў аўтобусамі. Цяпер з-за пандэміі наступіла зацішша, якое, спадзяёмся, хутка скончыцца. Тут ёсць што паказаць людзям, ёсць чым зацікавіць.

Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.

Бярозаўскі раён.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Вы прасілі расказаць

Багатыя на бялок прадукты, клятчатка і вітаміны

Як харчавацца пасля перанесенай каранавіруснай інфекцыі?

На каранавірус перахварэлі і паправіліся мільёны людзей ва ўсім свеце. Адны змагаліся з вірусам доўга і цяжка, іншым перамога далася хутчэй. Аднак любая хвароба вычэрпвае рэзервы арганізма. Як аднавіцца пасля COVID-19 і чым тут дапаможа харчаванне?

— Арганізм заўсёды супраціўляецца чужароднай інфекцыі, і на актыўную барацьбу з ёй накіроўваюцца ўсе сілы. Для сінтэзу антыцелаў і іншых ахоўных кампанентаў неабходны бялок, але праблема ў тым, што пры хваробе і асабліва павышэнні тэмпературы змяншаецца ці зусім знікае апетыт. Але наш арганізм разумны — ён знаходзіць абходныя шляхі і пачынае выкарыстоўваць уласныя рэзервы. Гэта значыць, неабходны бялок бярэцца з мышачнай тканкі, — тлумачыць **урач-эпідэміёлаг аддзялення асабліва небяспечных інфекцый Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана РАБКЕВІЧ.**

Страта мышачнай масы мае сур'ёзныя наступствы для здароўя. Аднавіць яе нялёгка, і часта гэта прыводзіць да незваротнага пагаршэння самаадчування.

Бялок, які паступае з ежай, з'яўляецца найлепшым будаўнічым матэрыялам для мышцаў і іншых клетак арганізма. Таму так важна забяспечыць паўнавартаснае, каларыйнае, багатае на бялок і вітаміны харчаванне падчас хваробы і пасля пры аднаўленні.

Бялкі ўтрымліваюцца ў мясе, рыбе, птушцы, сырах, яйках, малочных прадуктах, хлебе і бабовых. Пры страце вагі ў выніку хваробы гэты кампанент можа быць неабходны ў дадатковай колькасці. Ешце часта і невялікімі порцыямі, размяркоўвайце прыёмы ежы раўнамерна на працягу дня.

Не бойцеся прадуктаў з высокай тлустасцю — такіх як тлусты ёгурт, неразведзенае малако і сыр. Смела ешце сметанковае масла. За дзень неабходна выпіваць 1,5-2 літры вадкасці. Кава, чай, дыетычныя безалкагольныя напоі не дададуць вам здароўя і не дапамогуць стаць мацнейшымі. Піце фруктовыя сокі і ваду. Аднак звярніце ўвагу, што пры цукровым дыябеце не рэкамендуюцца салодкія безалкагольныя напоі і ліманад. Салёныя і вэнджаныя прадукты для аслабленага арганізма таксама пад забаронай. Найлепшая ежа для вас — прыгатаванае пад парай ці ў духоўцы.

Ашчадныя спосабы гатавання ежы дапамагаюць павысіць яе засваяльнасць і даюць арганізму магчымасць не расходаваць лішнюю энергію там, дзе гэтага можна пазбегнуць. Гародніна, фрукты, ягады, насенне забяспечваюць клятчаткай, вітамінамі, мінераламі, мікраэлементамі і, што вельмі важна, ствараюць спрыяльныя ўмовы для нармальнай работы мікрафлоры кішэчніка, а гэта неабходна для фарміравання імунітэту. Не забывайце, што трэба есці павольна і ў спакойным стане.

Калі пасля хваробы захоўваецца стомленасць, ешце невялікімі порцыямі, але часцей — патроху кожныя дзве гадзіны. Выбірайце мяккую і вадкую ежу, старайцеся, каб прыём адбіраў як мага менш сіл. Можна наразаць ежу на дробныя кавалачкі ці здрабняць яе з дапамогай кухоннага камбайна ці ручнога блэндара.

Калі на працягу некалькіх тыдняў хваробы колькасць ужытай ежы здаецца вам недастатковай, у большасці выпадкаў гэта паграмажае дэфіцытам вітамінаў і мінералаў. Каб пазбегнуць непажаданых наступстваў, прымайце полівітамінныя комплексы ці біялагічна актыўныя дабаўкі, папярэдне пракансультаваўшыся з урачом.

Сачыце за сваёй вагой. Гэта дапаможа вызначыць, ці дастаткова энергіі і пажыўных рэчываў паступае з ежай. Лепш рабіць тое адзін раз на тыдзень, пажадана ў адзін і той жа час і без абутку. Калі вага змяншаецца, трэба звярнуцца да ўрача.

На слыху

Якія сімптомы ў «Амікрона»?

Да штама «Амікрон», які ў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя выклікаў сур'ёзную заклапочанасць, пытанняў пакуль больш, чым адказаў, аднак некаторыя яго тыповыя сімптомы ўжо вядомыя. Адной з характэрных асаблівасцяў новага штама стала тое, што ён, у адрозненне ад больш ранніх варыянтаў каранавіруса, не выклікае страты нюху і смаку.

Характэрнымі сімптомамі «Амікрона» ўрач агульнай практыкі з Прэторыі (ПАР) Анжаліка Куцзі называе стомленасць і пачашчэнне сэрцабіцця. Таксама, паводле яе слоў, амікрон-штам праяўляе сябе ў цэлым нехарактэрным для COVID-19 пяршэннем у горле.

Яшчэ адзін урач з ПАР Унбен Пілэй адзначае, што па сваіх праявах новы варыянт каранавіруса больш за ўсё нагадвае грып — пацыенты скардзяцца на высокую тэмпературу, ламоту і сухі кашаль.

Варта адзначыць, што на дадзены момант найболш характэрнай прыкметай заражэння новым штамам называюць менавіта моцную стомленасць, якая раптам навальваецца на чалавека, што заразіўся. Зрэшты, самі па сабе стомленасць і апатыя, асабліва ва ўмовах скарачэння светлавога дня, не абавязкова сведчаць аб тым, што чалавек заразіўся «Амікронам».

Так ці інакш, калі на вас раптам навалілася стомленасць, у горле пяршыць, а ў целе адчуваецца ламота — гэта нагода неадкладна звярнуцца да доктара. Самастойна ставіць сабе дыягназ і пачынаць прыём якіх-небудзь прэпаратаў ні ў якім разе нельга.

Не заразіцца новым штамам, як і любым іншым, больш раннім варыянтам каранавіруса, дапамогуць толькі захаванне прафілактычных мер і вакцынацыя.

Навукоўцы працягваюць вывучэнне «Амікрона». Не выключана, што ў хуткім часе стануць вядомыя новыя сімптомы і асаблівасці дадзенага штама.

Неабходна ведаць

У ЗОНЕ РЫЗЫКІ

Як пажылым людзям засцерагчыся ад COVID-19

Новы штам «Амікрон», які выявілі ў лістападзе на поўдні Афрыкі, працягвае распаўсюджвацца па свеце, захопліваючы ўсё больш краін. Ён выяўлены ў большасці краін Еўропы, а днямі зафіксаваны і ў Расіі. Але пакуль усе выпадкі, пра якія вядома, былі лёгкія ці ўвогуле бессімптомныя. Не паведамляецца і пра смерці ад новага штама. Тым часам пажылыя людзі знаходзяцца ў зоне рызыкі і больш схільныя да захворвання на каранавірус. Менавіта ў іх з-за нагрузкі на імунную сістэму магчымыя ўскладненні, у тым ліку вірусная пнеўманія, наступствы для сардэчна-сасудзістай сістэмы і іншыя. Якія варта выконваць рэкамендацыі пажылым людзям, а таксама і тым, каму даводзіцца даглядаць хворага члена сям'і, каб пазбегнуць заражэння COVID-19, расказала ўрач-рэабілітолаг, загадчык аддзялення рэабілітацыі 11-й гарадской паліклінікі Вольга ЯЧЭЙКА.

ПРАВІЛЫ АСАБІСТАЙ ГІГІЕНЫ НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

1. Калі да вас прыйшлі госці, вітайце іх на адлегласці не менш як адзін метр кіўком галавы, пазбягаючы поціскаў рукі.

2. Прасіце гасцей і людзей, якія пражываюць з вамі побач, часцей мыць рукі.

3. Рэгулярна чысціце і апрацоўвайце антысептыкам паверхні ў сваім жыллі, асабліва тыя, да якіх часцей дакранаюцца іншыя людзі.

4. Калі хто-небудзь, хто з вамі жыве, адчувае сябе не вельмі добра (і асабліва калі ў яго ёсць сімптомы COVID-інфекцыі — павышэнне тэмпературы, кашаль, ламота, болі ў горле, заложанасць носа ці насмарк) — пастарайцеся менш з ім кантактаваць.

5. Калі вы захварэлі са з'яўленнем сімптомаў COVID-19, паспрабуйце да самастойнага наведвання ўстановы аховы здароўя звязацца з урачом па тэлефоне і ўзгадніць з ім вашы дзеянні.

6. У выпадку наведвання грамадскіх месцаў карыстайцеся такімі ж мерамі засцярогі ад інфіцыравання COVID-19, як і ва ўласным доме.

7. Старайцеся прытрымлівацца мер прафілактыкі інфіцыравання COVID-19 з даступных вам інфармацыйных крыніц.

КАЛІ ВЫ НА САМАІЗАЛЯЦЫІ

1. Пазбягайце цесных кантактаў з асобамі, у якіх ёсць сімптомы захворвання.

2. Калі вы захварэлі, заставайцеся дома.

3. Прыкрывайце нос і рот насоўкай пры чханні і кашлі.

4. Праводзьце апрацоўку паверхняў і прадметаў ужытку, да якіх часта дакранаюцца (сталы, выключальнікі, дзвярныя ручкі, ручкі шафак), з выкарыстаннем звычайных мыйных сродкаў і вады.

5. Мыйце рукі з мылам мінімум 20 секундаў, асабліва пасля наведвання санвузла, перад ядой, пасля смаркання, кашлю, чхання. Калі мыццё рук з мылам немагчымае, выкарыстоўвайце антысептыкі з утрыманнем спірту не менш за 60 %. Пры наяўнасці відавочных забруджванняў рукі абавязкова варта вымыць з мылам.

6. Не дакранайцеся да вачэй, носа, рота нямытымі рукамі.

Важна загадзя вызначыць пакой у вашай кватэры ці доме, які будзе выкарыстоўвацца для асобнага знаходжання членаў сям'і з сімптомамі захворвання. Загадзя плануйце яго прыборку. Калі гэта магчыма, хворы член сям'і павінен карыстацца асобным санвузлом.

КАЛІ ВЫ ДАГЛЯДАЕЦЕ ПАЦЫЕНТА З COVID-19

1. Сачыце за сваім самаадчуваннем. У выпадку развіцця сімптомаў, якія не выключаюць ковід-інфекцыю (ліхаманка, кашаль, задышка), паведаміце пра гэта медыцынскім работнікам па тэлефоне.

2. Пераканайцеся, што вы разумееце рэкамендацыі, якія пацыент атрымаў ад медыкаў, і здольныя дапамагчы вашаму блізкаму іх прытрымлівацца. Будзьце гатовыя дапамагчы яму з базавымі патрэбамі і справамі па доме, а таксама забяспечыць неабходнымі лекамі, прадуктамі харчавання і іншымі прадметамі.

3. Адсочвайце сімптомы і стан хворага. У выпадку пагаршэння звярніцеся ва ўстанову аховы здароўя па тэлефоне і паведаміце пра наяўнасць падазрэнняў ці лабараторнага пацвярджэння COVID-19.

4. Калі магчыма, не заставайцеся ў адным памяшканні з хворым, для яго павінен быць выдзелены асобны пакой. Па меры магчымасці карыстайцеся асобным санвузлом.

5. Забараніце іншым людзям, якія не пражываюць з вамі, без неабходнасці наведваць кватэру ці дом, дзе знаходзіцца хворы чалавек.

6. Падчас хваробы ён не павінен даглядаць сваіх хатніх жывёлін.

7. Рэгулярна выконвайце гігіенічную апрацоўку рук — мыццё з мылам не менш за 20 секундаў, пры немагчымасці выкарыстоўвайце антысептык.

8. Пазбягайце дотыкаў да вачэй, носа, рота нямытымі рукамі.

9. Хворы чалавек мусіць насіць медыцынскую маску, калі разам з ім у пакоі знаходзіцца хтосьці яшчэ. Калі пацыент не ў стане насіць медыцынскую маску, яе павінны насіць усе навакольныя.

10. Пры кантакце з біялагічнымі вадкасцямі пацыента варта надзець медыцынскую маску і пальчаткі.

11. Пазбягайце выкарыстання агульных прадметаў ужытку разам з хворым, такіх як кухонны посуд, сталовыя прыборы, ручнікі, пасцельная бялізна.

12. Штодня апрацоўвайце ці мыйце звычайнымі хатнімі мыйнымі сродкамі прадметы і паверхні, да якіх часта дакранаюцца: сталы, дзвярныя ручкі, сантэхніку, туалет, тэлефон, клавіятуру, планшэт, прыложкавыя столікі.

13. Часцей мыняйце і старанна мыйце адзенне і бялізну.

І памятайце, што найлепшым спосабам прафілактыкі з'яўляецца прышчэпка ад COVID-19.

РЕЗУЛЬТАТЫ Рекламной игры «Любимый кофе»

Завершилась Рекламная игра «Любимый кофе», участие в которой могли принять все граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане или лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь, достигшие возраста 18 лет, которые выполнили условия п. 10 правил Рекламной игры.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором и (или) заинтересованными лицами, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Рекламной игре было необходимо:

В период с 20 октября 2021 г. (00:00:00) по 14 ноября 2021 г. (23:59:59):

• Приобрести не менее одного Игрового продукта согласно перечню, указанному в п. 8 правил Рекламной игры и получить кассовый чек, подтверждающий приобретение Игрового товара.

• Зарегистрироваться на сайте www.mcgame.by, заполнить регистрационную форму, указав:

✓ персональные данные Участника: фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (при наличии), почтовый адрес (обязательно): почтовый индекс (желательно), область (желательно), район (желательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно), дом (обязательно), корпус (при наличии), номер квартиры (при наличии);

✓ адрес электронной почты (обязательно);

✓ номер мобильного телефона Участника в международном формате и название оператора (A1, MTC, Life) (обязательно).

• Загрузить фото или скан кассового/товарного чека с наименованием Игрового продукта в личном кабинете, указав дату и время покупки.

• Сохранить кассовый(-ые) чек(-и) до окончания Рекламной игры.

По результатам проведения Рекламной игры все 37 призов нашли своих обладателей.

Организатор Рекламной игры: общество с ограниченной ответственностью «Пиар Куб», УНП 192452588, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192452588 (далее – Организатор).

Место нахождения Организатора: 220030, г. Минск, ул. Ленина, д. 50, 5-й этаж, пом. 1.

Наименование Рекламной игры: «Любимый кофе»

Срок начала Рекламной игры: 20 октября 2021 г.

Срок окончания Рекламной игры: 10 декабря 2021 г.

Период, в течение которого можно стать Участником Рекламной игры: с 20 октября 2021 г. по 14 ноября 2021 г.

Рекламная игра зарегистрирована 12 октября 2021 года Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь. Свидетельство о регистрации Рекламной игры № 4082.

Общее количество участников: 11 196 человек.

Призовой фонд был разыгран полностью.

Полный список победителей Рекламной игры размещен на сайте: **www.mcgame.by.**

Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры **+375 (29) 308-19-61.**

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества СЗАО «ЛадаГарант»

Лот	Наименование	Местонахождение лотов	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Комплект полок для документов, 2 шт.	Республика Беларусь, Минский район, д. Обчак, 223010	127,20	12,72	6,36
2	Кресло офисное «Менеджер» DF HLN SP-A, 4 шт.		528,00	52,80	26,40
3	Стол письменный на мет. опорах, 1 шт.; стол письменный на мет. опорах, 2 шт.; стол письменный на мет. опорах, 2 шт.; стол письменный криволинейный левый, 1 шт.; стол письменный криволинейный правый, 4 шт.; стол письменный на мех. опорах, 1 шт.		4 620,00	462,00	231,00
4	Стол-приставка (К373), 1 шт.; стол-приставка (К371/Кредо/брнат), 6 шт.; стол-приставка (К372/Кредо/брнат), 6 шт.; стол приставка (К373/Кредо/брнат), 4 шт.; стол-приставка (К374/Кредо/брнат), 1 шт.		2 592,00	259,20	129,60
5	Тумба под системный блок (К510/Кредо/брнат), 11 шт.; тумба приставная, 9 шт.		1 317,60	131,76	65,88
6	Шкаф (Т404/Тема/плт), 1 шт.; шкаф для одежды (К49С+КДЗ/Кредо/брнат), 2 шт.; шкаф для документов, 2 шт.		3 218,4	321,84	160,92
	Тумба (Т180/Тема/брнат), 1 шт.; шкаф для документов (Т100+ТД12/Тема/плт/брнат), 1 шт.; шкаф для документов (Т404/13/0949+МТ1/13/0950/Тема/плт, 1 шт.; шкаф для документов, 1 шт.; шкаф для документов, 3 шт.; шкаф для документов, 2 шт.; шкаф для документов, 2 шт.	Республика Беларусь, г. Минск, ул. Щорса, 1А, пом. 16			
7	Копировальный аппарат Mita KM 1635, 1 шт.; копировальный аппарат Mita KM 1620, 1 шт.; аппарат факсимильный Panasonik KX-FT984RU-B, 1 шт.; системный ТА KPDP 38 SER/RUA, 2 шт.; сканер HP SJ G2710 A4, 1 шт.; принтер HP LJ 1010 USB с кабелем, 1 шт.; принтер HP LaserJet P1102, 1 шт.; терминал Panasonic KX-TS2365RUVV, 2 шт.; факс Panasonic KX-FP218 RU, 1 шт.; калькулятор Citizen SDC-435 N, 1 шт.		835,20	83,52	41,76
8	ПЭВМ Jet I (13C907) Intel G 2120; Intel G 2120, 4Gb. 500Gb DVD-RW, ATX-450W; ПЭВМ «DELTA» Delux; ПЭВМ SKI SYSTEMS; ПЭВМ Celeron; процессор Intel Celeron D341-2.93GHz/Мат. плата Asus P5PL2/Мод. памяти DDRII 512 MB/HDD 80GB SATA/FDD 3.5"/DVD-ROM Sony/Video GF PCX6200TC/ Корпус ATX 300W; сет. адаптер 2xD-Link 1-port UTP 10/100; Монитор 17" Philips 170S7FS; клавиатура; мышь компьютерная; ПЭВМ Celeron; процессор Intel Celeron D341-2.93GHz/Мат. плата Asus P5ПВ1/Мод. памяти DDR 512 MB/2xHDD 80GB SATA/FDD 3.5"/DVD-ROM Sony/Video GF PCX6200TC/ Корпус ATX 300W; сет. адаптер D-Link 1-port UTP 10/100; ПЭВМ Prestigio; Cel 1.8/1024/160/DWDRW/FDD; ПЭВМ Prestigio (системный блок); Монитор LCD Philips 170C8FS; клавиатура Chicony KB; ПЭВМ Prestigio; Cel. 3.2/512/160/DVDRW; монитор 19" ACER, 1 шт.; Keyboard, 1 шт.; мышь компьютерная, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio; Pen 4/512MB/80GB/FDD 3.5"/DVD-RW, 1 шт.; клавиатура, 1 шт.; мышь компьютерная, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio; Cel2/8/512/DVDCDRW, 1 шт.; монитор 19" LCD, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio 0799-1200 Celeron Dual-Core 1200/1024/160 DVDRW, 1 шт.; 170C8FS монитор Phyilips 17" LCD C8 FS, 1 шт.; ПЭВМ Prestigio 19B3645, 1 шт.; ПЭВМ МАП-51, 1 шт.; ПЭВМ МАП-51, 1 шт.; ПЭВМ МАП-51 INTEL, 1 шт.; ПЭВМ DELTA /ASROCK H61M-VG3/ INTEL; Pentium G2020 29ГГц/DDR3 4GB 1600MHz/ жесткий диск 500Gb SATA /лишущий CD-DVD/RW, 1 шт.; ПЭВМ Formoza; процессор 40 Gb/DDR 256Mb /300W/FDD, 1 шт.; ПЭВМ Formoza; мышь A4 Tech BW35, 1 шт.; ПЭВМ Formoza; клавиатура Chicony KB-9810MB PS/2. 1 шт.		1 012,80	101,28	50,64
9	Холодильник МХ-2823-80, 1 шт.		276,00	27,60	13,80

В отношении вышеуказанных лотов проводятся первые торги

Дата и время проведения торгов	**12 января 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и оплаты задатка	С 10.00 **8 декабря 2021 года** до 16.00 **10 января 2022 года**

Условия для участия в торгах:

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту __, СЗАО «ЛадаГарант», проводимых 12.01.2022.

2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста составляет 7,5 % (семь целых пять десятых процентов) от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться по телефонам: +375 29 304 25 60 (Андрей), +375 17 219 75 69 (Дмитрий).

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Информация о продавце	**СЗАО «ЛадаГарант», 220014, г. Минск, ул. Щорса, 1А, пом. 16 (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293953088 (Илья)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) **извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества ОАО «Авиакомпания Трансавиаэкспорт» (Продавец)**

Лот № 021221001:

САМОЛЕТ ИЛ-76ТД EW-78779

(сер. № 6706) (без авиационных двигателей), 1988 г. в., инвентарный номер 0799.

Местонахождение: г. Минск, территория Национального аэропорта «Минск».

Начальная цена продажи без учета НДС, доллар США – 696 150,08. Задаток, доллар США – 69 615,00. Шаг электронных торгов – 5 %. Штраф – 20 000,00 долларов США.

Электронные торги состоятся 28.12.2021 в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»).

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел).

Задаток на участие в торгах устанавливается в долларах США. Валюта платежа в счет перечисления задатка:

- для резидентов Республики Беларусь – белорусский рубль;
- для нерезидентов Республики Беларусь – российские рубли, белорусские рубли.

Расчетные счета для внесения задатков:

- в белорусских рублях: р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC банка BAPBBY2X;
- в долларах США: р/с BY68BLBB30120190055182001002 в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр-т Машерова, 29, BIC банка BLBBBY2X, УНП 190055182 / ОКПО 37492021. Счет 30111840100000000154 в ПАО Сбербанк Москва Россия, SWIFT код – SABRRUMM, БИК 044525225 / ИНН 7707083893, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в эл. торгах 28.12.2021 (Лот № 021221001). Срок внесения задатка:

- в долларах США – по 23.12.2021;
- в бел. руб. – по 27.12.2021 до 11.00.

Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляются на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами: **27.12.2021 в 12.00.**

Организатор электронных торгов:

☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • www.торги.бел • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении 21 декабря 2021 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Наименование имущества:

- оборудование, инвентарь, мебель, офисная техника в количестве 130 лотов.

Наименования и стоимости лотов указаны на сайте www.deloocenka.by, раздел аукционы.

Продавец: ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз», Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42.

Контактный телефон +375 29 655 50 51.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений заканчивается 20.12.2021 г. в 17.00.

С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом (ИП) РБ – копии свидетельства о государственной регистрации юр. лица (ИП), устава юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность; представителем физ. лица (ИП) РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, физ. лица, ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет 31, 32, 33 стр. паспорта, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by.

Утерянные свидетельство о гос. регистрации, печати и штампы частного транспортного унитарного предприятия «РопноАвтоРазборочка» (211413, Полоцкий район, с/с Боровухский, д. Ропно, ул. Двинская, д. 12, УНП 391156909) **считать недействительными**.

Напярэдадні...

Яркі агонь — да ўдачы

Сустракаючы Каляды і Новы год, людзі заўсёды марылі аб тым, каб ён быў шчаслівым. Як жа прыцягнуць, прывабіць удачу? Як зрабіць гэтыя цудоўныя зімовыя святы больш запамінальнымі і рамантычнымі? Мне здаецца, проста: з дапамогай святла.

Перш за ўсё нам спатрэбіцца многа свечак. Я іх купляю загадзя, рознай формы і памераў. А вось падсвечнікі можна зрабіць самім, прасвідраваўшы адтуліну ў яблыку, рэпе, бураку, круглай бульбіне...

Добра скарыстацца і яловымі шышкамі, калі акуратна зрэзаць у іх верхавінкі, у сярэдзіну накапаць воску і ўмацаваць на падстаўкі з пенапласту. Упрыгожыць іх можна яловымі ці хваёвымі лапкамі, пакрытымі «снегам» (крошкамі таго ж пенапласту), маленькімі цацкамі, яркімі банцікамі, «дожджыкам», цукеркамі... Вакол свечак з дапамогай зубачыстак можна замацаваць яркія ягады каліны, рабіны, бліскучыя пацеркі...

Падсвечнікамі ў час свят могуць «папрацаваць» таксама попельніцы, фужэры, маленькія вазачкі.

Здаўна свечкі выкарыстоўвалі і для варажбы. Лічылася: калі свечка доўга не загараецца, значыць, у найбліжэйшы час нешта запланаванае можа не спраўдзіцца. Калі полымя замігае — у жыцці адбудуцца перамены, а яркі агонь — знак шанцавання і ўдачы.

Запальваючы свечку, можна загадаць жаданне. Калі кроплі воску пацякуць па левым баку, яно не збудзецца, калі па правым — вам пашанцуе.

Праявіце крыху фантазіі — зрабіце свой дом святочным і радасным. І тады, магчыма, акурат такім жа стане для вас Новы год!

Софія Кабарыха,

в. Паланечка, Баранавіцкі раён.

Чалавек — чалавеку

З кім павядзешся...

Гэтай вясной у нас па лецішчы з'явіўся новы сусед. Як данесла мясцовае «радыё», у Беларусь ён прыехаў ажно з... Іарданіі, ажаніўся тут з нашай дзяўчынай, разам з ёй гадуюць прыгожых чарнавокіх малых.

А дом, які прыкупіў, прадаваўся даўно — не было ахвотных набыць. Участак паступова зарастаў хмызняком, пустазелле насейвалася на іншыя гароды...

Факт, што, убачыўшы новага, маладога гаспадара, які, закасаўшы рукавы, узяўся за навядзенне парадку, мы з палёгкай уздыхнулі, а потым, шчыра кажучы, захвалявaліся — сталі баяцца, што гэты дачнік зараз цяпне ліха, зморыцца і плюне. «Наш чалавек, беларус, можа, і даў бы тут рады, — між сабой гаварылі суседзі, а вось гэты іншаземец — наўрад... Дзе яго Іарданія? Там, можа, і не расце нічога — адна пустыня ды горы?»

Але ж тут, на ўчастку, неяк залапатаў трактар і як бачыш перавярнуў «закамянелы» пласт дзірвану. А далей — болей, як той казаў: побач з домікам стаў зелянець газон, з'явілася альтанка і па перыметры — прыгожы штыкетнік... «Малайчына! — дзівіліся мы, — бач ты, які зацяты! Як сапраўдны беларус: упрагаецца і цягне — даводзіць да канца».

Толькі пахвалілі ды прагаварылі так, як сусед узяў і... знік: тыдні са тры відаць не было. Мы чаго ні надумалі: можа, узяў ды ўсё-такі кінуў, можа, крый бог, захварэў?

Але ж не: дзякуй богу, вяртаецца — задаволены, яшчэ больш загарэлы. Кажа:

— Сустракаўся з раднёй — у Грузіі, на нейтральнай тэрыторыі, бо ў Іарданію і пералёт дарагі, і каранцін кругом... А ў Грузіі спадабалася, нават больш, чым у Турцыі і Егіпце... Людзі добразычлівыя ды сумленныя — амаль як мы (?), беларусы, мы толькі больш цягавітыя: бывае, упромся ў што...

Выходзіць, з кім павядзешся, ад таго і набярэшся. Ці не так?

Віталь Жураўскі,

г. Жодзіна.

Свой погляд

РОДНАЯ ЗЯМЕЛЬКА — МАЦІ, А ЧУЖАЯ...

Падзеі на беларуска-польскай граніцы хвалююць многіх, а ўжо тых, хто ведае, што такое вайна, што такое вялікая бяда... Няхай па ўспамінах бацькоў і дзядоў, няхай па фільмах і кнігах... Нават гэтага часам дастаткова.

НАШ родны край у красавіку 1986-га пацярпеў ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Праўда, людзі пра гэта амаль не чулі, не ведалі: ішлі на Першамайскую дэманстрацыю, садзілі бульбу, смела гулялі па вуліцах...

І тады, і пазней многія набралі на сябе атруты, хварэлі і паміралі. Не стала і майго малодшага сына. Яму было ўсяго 14. Аднак сёння я хачу ўспомніць той час, калі наш Юра быў яшчэ жывы і калі краіны далёкага замежжа сталі запрашаць нашых дзяцей на аздараўленне, спачатку — цэлымі класамі, а пасля паасобку. Тады, дзякуючы немцы Одзе-Марыі фон Шуберт, яе запрашэнню, нават я разам з Юрам пагасціла ў Германіі, на свае вочы пабачыла замежнае жыццё. Шмат што захавалася ў памяці.

Ну, па-першае, спадарыня Ода-Марыя, у якой у 18 гадоў трагічна загінуў унук, рабіла ўсё, каб нам было камфортна і цікава. На жаль, маё валоданне нямецкай не дазваляла больш-менш свабодна гутарыць з ёй, і таму ў размовах нам калі-нікалі дапамагалі сябры гаспадыні — Уладзімір і Галіна, людзі адукаваныя, інтэлігентныя. Да пераезду ў Германію яны жылі пад Масквой, працавалі выкладчыкамі, мелі навуковыя ступені, аднак трымаліся вельмі проста. Я не пыталася, што прымусіла іх пакінуць радзіму, а тым больш Маскву, але заўважыла, што ў іх галасах пастаянна адчуваўся сум.

Неяк раз яны прыйшлі да Оды-Марыі, каб запрасіць нас з Юрам «у клубніцы». Гаспадыня дала нам па невялічкім лёгкім кошычку, і ўчацвярых мы рушылі...

Я дрэнна ўяўляла, куды. Ішлі пехатой, досыць доўга. Уладзімір з Галінай усю дарогу пра нешта пыталіся, мы з Юрам адказвалі — расказвалі пра сваю Беларусь, пра наша жыццё. А вось ад спадарожнікаў пачулі зусім няшмат: хіба тое, што, дапамагаючы фермеру і збіраючы ягады, можна (і нават трэба) іх есці (асабліва калі фермер адыдзецца)...

Дабраўшыся да месца, нас вельмі ўразіла поле — велізарнае, з доўгімі, роўнымі радамі ягад самых розных сартоў — спелых, прыгожых... Праўда, я іх амаль не каштавала, бо клубніцы — гэта не маё (іншая рэч — суніцы!)... А вось іншыя зборшчыкі елі: якраз так, як вучылі і нас.

Але гэта яшчэ не ўсё. Вярнуўшыся ў горад, мы разам з нашымі спадарожнікамі зайшлі на пошту (ім трэба было). І там, адчыняючы дзверы, Уладзімір неяк няўдала зачапіўся за дыванок — упусціў свой кошычак з клубніцамі. Ягады рассыпаліся па падлозе і, вядома ж, пабіліся, ледзь не распаўзліся... Я чакала, што зараз з'явіцца хтосьці з венікам, змяце іх у шуфлік, каб выкінуць. І памылілася. Нашы спадарожнікі сталі іх збіраць у той самы кошык, казаць, што дома зробяць з іх «мермеладэ». Мы з Юрам пераглянуліся і шчыра пашкадавалі, што жывём так далёка, што не можам падзяліцца — пачаставаць гэтых людзей «мармеладамі» са сваіх суніц, чарніц, вішань, маліны, сліў, ажын, парэчак, агрэсту... А потым яшчэ доўга думалі над тым, ці сталі б гэтыя людзі збіраць клубніцы — і на фермерскім полі, і на падлозе, — жывучы ў Падмаскоўі. Мне здавалася, што наўрад...

БЫЛО ў нас і яшчэ адно вельмі памятнае знаёмства. Неяк у нядзелю пасля тэлефоннага званка Ода-Марыя сказала, што нас запрашаюць да сябе Ганна і Пётр Кеслеры. Юра ўжо ведаў гэтых людзей, іх дом, і мы пайшлі.

Сустрэлі нас там як родных, але гэта ўразіла куды менш, чым гісторыя іх жыцця. Аказалася, што Пётр — этнічны немец, што яго сям'ю «дабравольна-прымусова» з Паволжа выселілі ў Іркуцк, што ён вырас там і з першых дзён вайны трапіў на фронт, што пасля няўдалага бою пад Смаленскам уся іх рота аказалася ў палоне і збегчы адтуль нікому не ўдалося, што дужэйшых (з тых, каго не расстралялі) адправілі на работы ў Германію. Такім чынам Пётр трапіў на хутар, стаў парабкам, бо павінен быў рабіць усё, што скажа гаспадар: даглядаць скаціну, апрацоўваць зямлю...

Ганна — родам з-пад Ленінграда. Настаўніца. У лапы фашыстаў трапіла ў час аблавы. У Германіі апынулася разам з іншай моладдзю, з ёй жа працавала на заводзе. Умовы, як расказвала, былі страшэнныя: людзей трымалі горш, чым скаціну, — у халодных буданах. І кармілі — абы ногі цягалі вы працавалі... За марудлівасць і брак білі, знясіленых дабівалі...

Яе, было, таксама забралі ад іншых, некуды павялі... Думала, на расстрэл, бо пасадзілі ў кузаў, прывезлі ў нейкі хлеў... А раніцай паказалі статак кароў і цялят, які яна павінна была даглядаць. Спраў, як расказвала, было з галавой, і яна іх рабіла подбегам — яшчэ і таму, што вопратке не мела ніякай — баялася захваробы. Ведала, што парабкаў лячыць тут ніхто не будзе. А памрэш — прывязуць новага ці новую...

Адно добра, што кармілі хоць трохі лепш... А другое — лёс звёў з Пятром, які ведаў нямецкую мову, чуў сам і Ганне пераказваў, што гоняць немцаў з роднай зямлі, што вызваленне ўжо блізка і яны змогуць вярнуцца дамоў.

Надзея на гэта надавала сіл, і таму не дзіва, што, пачуўшы пра перамогу, Ганна і Пётр на веласіпедах былых гаспадароў паехалі ў бок роднага краю.

У Польшчы на адным з прыпынкаў разгаварыліся з савецкімі салдатамі, і тыя, пачуўшы, што з імі было, сказалі, што на радзіме іх чакае калі не расстрэл, то зняволенне — дакладна, прычым пажыццёвае, недзе на Калыме...

І ўсё, як расказвалі гэтыя сужэнцы: схавалася сонца, на зямлю апусцілася неба. Яны плакалі ўголас і баяліся глядзець адно на аднаго — думаць, хто з іх большы здраднік Радзімы.

Каля сутак яны прасядзелі ў Польшчы, а потым вярнуліся назад у Германію, сталі жыць разам і працаваць ад цямна да цямна, бо абое былі голыя і босыя, не мелі жытла, потым з'явіліся дзеці.

Каб хоць неяк абжыцца, павялічыць свае даходы, Пётр з Ганнай пераехалі ў Аргенціну, дзе ўвесь час цёпла. Трымалі кароў, авечак, коней, якія самі, можна сказаць, карміліся, збіралі добрыя ўраджаі. Старэйшыя дзеці (а ў сям'і іх стала 17) ва ўсім дапамагалі... Аднак бацькі цудоўна разумелі, што без добрай адукацыі ім прыйдзецца цяжка, і таму зноў вярнуліся ў Германію... Хоць хацелася ў Расію. Дзеля гэтага, як казалі, згодны былі б нават панесці пакаранні!

...КАЛІ Саюз распаўся, у сужэнцаў з'явілася магчымасць праведаць родных — яны паляцелі ў Іркуцк.

Бацька Пятра не дажыў да гэтай сустрэчы, на вайне загінуў і брат. А вось старэнькая маці і сёстры не ведалі, як славіць Госпада за магчымасць абняць сына і брата...

З тых самых часоў Ганна і Пётр сталі марыць аб паездцы ў Ленінград. Ужо нават былі сабраліся, але Ганна трапіла ў бальніцу, перанесла складаную аперацыю, пасля якой зусім не стала здароўя: адбілася на ім і аблава, і холад з голадам, і шматгадавая непасільная праца.

...Што здзівіла тады — у доме Пятра і Ганны панавала руская мова. На ёй размаўлялі гаспадары, іх дзеці і ўнукі, якія ў той час займалі розныя пасады, але вельмі любілі бацькоў і свой «рускі дом».

Наведаўшы яго другі раз, мы гаспадара не заспелі: ён збіраў дакументы, каб зноў паляцець у Расію да родзічаў. А яго жонка Ганна, страціўшы на гэта надзею, усё распытвала мяне пра Беларусь і ўрэшце пацікавілася, ці не магла б я зрабіць ёй падарунак — дасласць духі «Красная Москва» і мыла «Сірень». Казала, што іх водар помніцца з тых часоў, калі жыла на радзіме, і што гэтыя ўспаміны дапамагалі ёй выстаяць: не страчваць прытомнасць каля станка на заводзе, у чаканні расстрэлу, на чужой ферме...

Перад ад'ездам мы зайшлі ў дом Кеслераў, каб развітацца, і Ганна, не хаваючы слёз, сказала, што паехала б з намі ў Беларусь... А на сваю радзіму дык пайшла б нават пешкі!

...Людзі, мусіць, праўду кажуць, што родная зямелька — маці, а чужая — мачаха.

Ларыса КУПРЫЯНЧУК,

Рагачоўскі раён.

«Са "Звяздой" цяплей»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 студзеня 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 тэрмасаў універсальных для ежы і напояў ARIZONE і суперпрыз — электрасамавар Kelli. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 29 студзеня 2022 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2022 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда» чытайце ў нумары 235 газеты «Звязда» ад 4 снежня 2021 года.

Тэлефоны для даведак: (017) 271 81 53, 311 17 40.
Тэрмін правядзення гульні — 7—31 снежня 2021 года.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4117 ад 30.11.2020 года, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

на I квартал або I паўгоддзе 2022 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) *(індэкс)*

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

«ГЭТА ВЫДАТНА, ШТО МОЖНА ПРОСТА ЖЫЦЬ...»

Тры спробы «песняра» Уладзіслава МІСЕВІЧА выйсці на пенсію

Заслужаны артыст БССР, адзін з заснавальнікаў вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры» Уладзіслаў Місевіч у трэці раз выйшаў на пенсію. «Але гэта пакуль недакладна. Вось сольную кар'еру пачынаю», — смяецца музыкант. Раптам усвядоміла, што мы знаёмыя дваццаць гадоў, а Місевіч не змяніўся, усё ж такі: жыва цікавіцца ўсім вакол, востры на язык, эрудзіраваны і іранічны. Вось тут бы ён паправіў і падкрэсліў: самаіранічны.

— Уладзіслаў Людвігавіч, і ў сваёй кнізе «Я роман с продолженьем пишу», і ў інтэрв'ю вы заўсёды сціпла ацэньваеце сябе як музыканта. А ці не шкадуеце, што ў свой час прыйшлося наступіць на горла музычным амбіцыям і стаць Змеем (так музыканты называлі Місевіча. — Аўт.)?

— Музыкант, як, зрэшты, і артыст балета, прафесію набываем з дзіцячых гадоў. Менавіта тады закладваюцца асновы. У дваццаць гадоў засваенне новых музычных навыкаў становіцца праблематычным. Так што прафесійным музыкантам і артыстам балета ў пенсіённы стаж добра было б уключаць і гады вучобы, таму што ўжо тады, па сутнасці, пачынаецца праца, хоць і не аплачваемая.

Вучыўся я па класе фартэпіяна і кларнета, але іграў больш на саксафоне, які мне вельмі падабаецца. Калі ўтварыліся «Песняры», спатрэбіліся розныя духавыя народныя інструменты і флейта, таму даводзілася ўзмоцнена займацца. Вось гэтая шматзадачнасць не спрыяла таму, каб стаць высакакласным музыкантам. У «Песнярах» усё было падпарадкавана агульнай справе. Патрэбны Місевіч на бэк-вакале, значыць, буду спяваць. Даручыў Мулявін адказваць за дысцыпліну, значыць, буду Змеем. Так склаўся лёс, што музычная планка аказалася заніжанай. Шкадую аб гэтым? Не, таму што гэта непрадукцыйна. А галоўнае — маё жыццё прайшло ў музыцы, і гэта тое, пра што я марыў з дзяцінства.

— Постпесняроўская гісторыя пачалася, калі вам было 53 гады, сольная — каля 50. У такім узросце артысты сыходзілі з эстрады, а вы пайшлі на другі заход — стварылі гурт «Беларускія песняры». І ўсё атрымалася! І не пяць гадоў, як думалі, а вось ужо больш за дваццаць гадоў прайшло. Як гэта стала магчыма?

— Можа, ад адчаю? Больш жа нічога не ўмелі, акрамя як спяваць і граць. А калі сур'ёзна, то прыйшлося пераступіць праз сябе. У прафесіі — новыя людзі, усё перавярнулася. Трэба было вучыцца выбудоўваць новыя адносіны ў новым часе. Але і без слова «песняры» шанцаў у нас не было б. Тады сапраўды адкрылася другое дыханне, у прыярытэце была творчасць.

Зараз, азіраючыся на той адрэзак часу, я разумею, што маё пакаленне значна мацнейшае, чым наступнае, як гэта ні дзіўна.

— Гэта міф ці праўда, што тады вы з'ехалі ў Маскву, тамму што ў філармоніі пачаўся рамонт і засталіся без памяшкання?

— Так, падштурхнула менавіта гэтая акалічнасць. Было і разуменне, што зручней атабарыцца ў Маскве, усё роўна большая частка нашага часу праходзіла ў гастролях па Расіі ды іншых краінах. Важны момант: хоць фірму мы зарэгістравалі ў Расіі, але ўсе дакументы, якія даюць на гэта падставы, уключаючы назву, атрымалі ў Беларусі.

Цяпер магу сказаць, што гэта быў адзін з найлепшых перыядаў як у творчым плане, так і ў жыццёвым. На жаль, не мы першыя ў Маскве кар'еру зрабілі, не мы апошнія. Я часам думаю: а хто пасля нас? Сярод моладзі вылучыў бы Пятра Ялфімава — сучасны, модны, што не перашкаджае быць прафесіяналам. Але ён ужо таксама ў Маскве...

— Уладзіслаў Людвігавіч, упершыню вы сышлі на пенсію даволі рана. Быў такі прывілей у музыкантаў, якія іграюць на духавых інструментах. Які настрой быў тады?

— Дрэнны, калі шчыра. Гэта быў 1992 год. Тады сапраўды ў духавікоў, менавіта эстраднікаў, з'явілася магчымасць сысці на пенсію пры наяўнасці 25-гадовага стажу. У той час справы ў «Песнярах» ішлі няважна. Акрамя нашых, так бы мовіць, унутрыкалектыўных праблем, існавалі і знешнія: зламалася ўся савецкая гастрольна-канцэртная сістэма. Нікому не патрэбны былі сур'ёзныя музычныя праграмы, прыйшоў час папсы.

Прыкладна за паўгода да майго сыходу з ансамбля Мулявін прапанаваў мне пасаду дырэктара калектыву. Я сказаў: добра, але мне хацелася, каб ты спярша вырашыў сваю вядомую ўсім праблему, інакш як я змагу прад'яўляць жорсткія патрабаванні да астатніх музыкантаў? Ён прамаўчаў, больш да гэтай размовы не вяртаўся. Менавіта з таго моманту адбыўся разрыў нашых чалавечых адносін. А апошнія месяцы мы наогул не размаўлялі. Я дапрацоўваў да пенсіі. Вось гэта «дапрацоўваў», яно так жахліва гучыць... То-бок, ты ўжо сам ведаеш, што сыходзіш і ніякіх планаў не маеш, і калегі цябе ўжо як быццам спісалі...

Пенсія была эквівалентная 50 доларам. Усё навалілася адразу: сыход з «Песняроў», развод з першай жонкай. У 47 гадоў прыйшлося вярнуцца жыць у філарманічны інтэрнат. Работу па спецыяльнасці нават не разглядаў, вырашыў заняцца прадпрымальніцтвам.

— У той час, мне распавядалі, вам як нажом па сэрцы, было калі вас называлі былым «песняром».

— Гэта праўда, вельмі чапляла. Як і тое, што многія, як мне здавалася, прыяцелі адразу страцілі цікавасць. «Пясняр» Місевіч, аказваецца, быў больш статусны, чым прадпрымальнік Місевіч.

— Што за непрыемны сюрпрыз вас чакаў пры афармленні пенсіі па ўзросце?

— Той, што дырэктар ансамбля, якому мы вельмі давяралі, як высветлілася, не плаціў унёскі ў пенсіённы фонд. Хоць часам нават збіраў з нас наяўныя: маўляў, трэба закрыць плацяжы. Сябры нас папярэджвалі, што ў Маскве такія фінты магчымыя.

Дарэчы, тады ж я даведаўся, што і пяць гадоў у бізнесе ў страхавы стаж не ўвойдуць, таму што бухгалтар не здаў дакументы ў архіў. І таксама працаваў не старонні чалавек, а знаёмы, які карыстаўся даверам.

Вядома, я ведаў адну з асноўных запаведзяў бізнесу: працаваць трэба з прафесіяналамі, а не з прыемнымі людзьмі. Але парушыў яе, за што і паплаціўся.

«Песняры» для Беларусі — значна больш, чым толькі музыка. Менавіта яны прымусілі беларусаў успомніць сваю мову, сваіх паэтаў. Гэта ж фенаменальна, што ў СССР людзі куплялі беларускія размоўнікі, слоўнікі, каб разумець нашы песні».

— Трэці раз вы ціха сышлі на пенсію, але папярэднічала гэтаму кроку канфліктная сітуацыя. У чым яе сутнасць?

— Дваццаць гадоў мы з гуртом збіраліся разам і абмяркоўвалі ўсё: ад новай песні да райдара. А тут раптам некалькі калег прымаюць сур'ёзнае рашэнне, не параіўшыся з іншымі. Калі маё меркаванне не ўлічваецца, значыць, трэба сыходзіць у адстаўку. Быў абураны і расчараваны, але і з сябе віны не здымаю, таму што дапусціў такую сітуацыю.

Да таго ж у нейкі момант я адчуў, што нават шэсць-сем гадоў розніцы з калегамі — гэта шмат. Што ўжо казаць пра 16 або 30? Такія супярэчнасці таксама неяк вылезлі вонкі.

— Напэўна, гэта вельмі непрыемна — раптам апынуцца па-за гульнёй? Разумныя людзі кажуць, што працоўную дзейнасць трэба спыняць паступова...

— Зрабіць гэта паступова дапамог каранавірус: пэўны перыяд часу канцэртаў не было ўвогуле, потым яны здараліся вельмі рэдка. Не магу сказаць, што так ужо раптоўна ўсё адбылося. З прычыны ўзросту я задумваўся, што такі момант надыдзе. Многія артысты кажуць, што лепш сысці на год раней, чым на месяц пазней, але не ва ўсіх атрымліваецца, таму што са сцэнай цяжка расставацца.

Мне вось гэты трэці выхад на пенсію даўся адносна лёгка. Напэўна, таму, што ўсё добра ў жыцці, перш за ўсё, ёсць падтрымка сям'і.

— Чытала інтэрв'ю з гламурнай расійскай спявачкай, яна наракала, што дайшла да жабрацтва за час пандэміі: даводзіцца есці грэчку з курыцай. А вам пенсіі хапае?

— Гламур для нашага пакалення — гэта нешта прыгожае, але шкоднае, парадыйна-смешнае. Але калі артысту гэта дапамагае, то няхай... Выгляд гламурнага беларускага артыста, на жаль, выклікае шкадаванне, спачуванне, што пераходзіць у пагарду. Яны прайшлі міма прафесіі, прыкрываючыся гламурам. У Расіі артысты вельмі добра зарабляюць, можна стварыць сабе падушку фінансавай бяспекі, але ў некаторых усё сышло ў гламур. Так што няхай невядомая мне калега падумае аб тых суайчыннікаў, для якіх курыца з грэчкай — святочная страва.

Зараз займаюся афармленнем надбаўкі да пенсіі — такі прывілей ёсць як у заслужанага артыста БССР. У 47 гадоў неяк няёмка было нешта яшчэ прасіць, як мне тады здавалася, а потым рукі не даходзілі заняцца зборам дакументаў.

Паколькі я родам з СССР, то даволі доўга жыў з думкай, што дзяржава паклапоціцца пра ўсё, у тым ліку пра маю забяспечаную старасць. Цяпер усё больш сумленна: не толькі эксперты, але і чыноўнікі кажуць, што на пенсію трэба самім назапашваць грошы з маладосці.

На памер пенсіі паўплывалі і мае памылкі з выбарам дырэктара ансамбля і бухгалтара ў нашай фірме. Задаю сабе пытанне: «Місевіч, у цябе аднаго сціплая пенсія?». Не, сотні тысяч людзей у такім жа становішчы. Але ў мяне ў «Песнярах» было такое жыццё і такія магчымасці, якіх не было ў гэтых соцень тысяч людзей. Дык на што мне скардзіцца?

Усё ўжо для жыцця зароблена: нармальная кватэра, любімая дача, аўтамабіль. Жонка Вольга — цудоўная гаспадыня, якая ў нашы не самыя сытыя гады ўмела з нічога прыгатаваць нешта смачнае. Дачка ад першага шлюбу Каралі на і прыёмны сын Дзіма — паспяховыя ў жыцці і сваіх прафесіях, добра зарабляюць, ім не трэба дапамагаць.

— Але вы з Вольгай, калі што, можаце разлічваць на іх дапамогу?

— Не сумняваюся. Але хацелася б пражыць, не абцяжарваючы дзяцей.

— Ведаючы вашу дзейную натуру, цяжка ўявіць вас у ролі такога пенсіянера-лайдака... Як час бавіце?

— Нездарма пенсію называюць заслужаным адпачынкам. Цяпер ужо магу сказаць, што рады такому перыяду ў жыцці, калі нікуды не трэба спяшацца, нічога не трэба арганізоўваць. Гэта выдатна, што можна проста жыць, атрымліваць асалоду ад зносін з цікавымі суразмоўцамі і малодшым пакаленнем сям'і, бачыць тое, што раней проста не паспяваў, разважаць пра мінулае і думаць пра будучыню.

— Ці кантактуеце з былымі калегамі?

— У нашым узросце дрэнна рабіць выгляд, што незнаёмыя. Нас па-ранейшаму звязваюць дзелавыя адносіны: з заснавальнікаў «Беларускіх песняроў» я не сыходзіў, а гэта значыць, што нясу пэўную адказнасць за іх работу. Нядаўна патэлефанавалі сябры з Масквы, папрасілі арганізаваць канцэрт ансамбля, але пры ўмове, што і я выйду на сцэну. Сустрэліся, правялі некалькі рэпетыцый, калектыў у добрай творчай форме, канцэрт прайшоў выдатна. Усе задаволеныя: і артысты, і публіка. Але гэта не значыць, што я вярнуўся ў ансамбль.

— Уладзіслаў Людвігавіч, не толькі на мой погляд ваш вопыт з кнігай «Я роман с продолженьем пишу» аказаўся вельмі цікавы і паспяховы. Не думалі прыступіць да работы над гэтым самым працягам?

— Не, таму што менавіта перыяд «Песняроў» галоўны, вызначальны. І вось пра яго варта казаць. «Песняры» для Беларусі — значна больш, чым толькі музыка. Менавіта яны прымусілі беларусаў успомніць сваю мову, сваіх паэтаў. Гэта ж фенаменальна, што ў СССР людзі куплялі беларускія размоўнікі, слоўнікі, каб разумець нашы песні. Таму маю дзёрзкую мару, каб мая кніга выйшла на беларускай мове і па даступнай цане. Але каб гэта ажыццявілася, трэба стаць прадзюсарам сваёй жа кнігі.

— Як адчувалі сябе ў іпастасі саліста ў канцэрце-прэзентацыі кнігі музыказнаўцы Вольгі Брылон «Беларуская эстрада. Настальгічны дывертысмент»?

— Кніга Вольгі — тытанічная, энцыклапедычная праца. Гісторыя нашай эстрады з 1930-х і да канца 80-х гадоў. Не ведаю, ці знойдзецца чалавек, які возьмецца напісаць ужо пра найноўшы перыяд. У канцэрце бралі ўдзел некаторыя героі кнігі. У свой час Мулявін менавіта для мяне напісаў дзве песні на вершы Яўгенія Еўтушэнкі і Сяргея Крылова. Спяваць у суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча — прыемны настальгічны момант, бо яшчэ ў пачатку 1970-х «Песняры» выступалі разам з гэтым калектывам у Маскве і зрабілі фурор. Толькі цяпер, чарговы раз выйшаўшы на пенсію, зразумеў, што былых «Песняроў» не бывае і сёння сапраўдныя — менавіта былыя. І гэта абавязвае.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НАДВОР'Е ШЭПЧА...

(лірычны фотарэпартаж)



ЗІМА, сапраўдная зіма! Азіраючыся і прыгадваючы першыя дні снежня, асабліва першыя выхадныя дзянькі, я з асалодай акунаюся ў бадзёры, святочны настрой, якім парадавала нас матухна-прырода. Па-першае, даўно такога цуду не было: каб каляндарная зіма і адпаведнае надвор'е аднолькава супалі, прыйшлі амаль адначасова, так бы мовіць, поруч. Так і просіцца вымавіць: абдымаючыся! Згадзіцеся: тут і лёгкі марозік, і пушысты сняжок, і блакітнае неба, сонейка... Фантастыка, сапраўдныя лекі для душы, раскоша для вачэй. Таму, а гэта ўжо па-другое, адпаведны настрой у людзей, якія, не дамаўляючыся, спяшаліся ў двары і на вуліцы, у скверы і паркі. Надвор'е шаптала... Сталіца не чакала такога сюрпрызу, бо напярэдадні ў прагнозах вымалёўвалася іншая карціна. А тут вось табе: над Мінскам утварыўся мяккі антыцыклон і нагадаў, што зіма ў нашай старонцы — прыгожы, вясёлы і, самае галоўнае, здаровы час! Прыгадайце і гляньце на румяныя тварыкі дзяцей, як яны радуюцца першаму снегу, хуткім санкам, усмешкам бацькоў! Радуюцца і дарослыя, бо ім таксама падабаецца паволі прагульвацца па алеях і сцежках, яшчэ не схаваных пад гурбамі, рабіць сэлфі, катаць малых у каляскі або на цюбінгах. Вось і я, падпарадкаваўшыся агульнаму настрою, узброены фотаапаратам, паспяшаўся ў куточак на беразе Свіслачы, дзе шмат адпачывальнікаў, каб разам з імі палюбавацца надыходам зімы.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Правила проведения рекламной игры

«Двигайтесь в ритме Volvo»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Двигайтесь в ритме Volvo» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Двигайтесь в ритме Volvo» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

Платежный документ – документ, подтверждающий факт оплаты товаров/услуг, который должен содержать сведения об УНП (учетном номере плательщика) продавца, дате оплаты, и цене приобретенного товара/услуги. Платежным документом в настоящих Правилах может выступать:

- кассовый/товарный чек, полученный у кассира/администратора/специалиста по лизингу/рент-агента;
- банковское платежное поручение;
- карт-чек, подтверждающий оплату через ЕРИП.

1. Организатор Рекламной игры.

Организатором Рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18б, 2-й этаж, пом. 5, УНП 190771520, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 02.11.2006, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190771520.

2. Заинтересованные лица Рекламной игры.

ЗАО «ЭЛИТАВТО», УНП 101278172, 220114, г. Минск, пр. Независимости, 169, каб. 812.

